

АБ ВАЖНАСЦІ СЯМЕЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

Сямейная газета

САКРЭТЫ ПОСПЕХУ ІРЫНЫ ВАРФАЛАМЕЕВАЙ



Сямейная газета


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 114 (30248)


**Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Кіраўнікі дзяржаў абмяняліся думкамі аб сітуацыі ў рэгіёне і перспектывах яе развіцця. Абмяркоўваліся таксама эканамічныя пытанні і рэалізацыя дамоўленасцяў у сферы эканомікі і бяспекі, дасягнутых у Мінску падчас нядаўняга афіцыйнага візіту расійскага лідара. Пытанні абароны і бяспекі ў цэлым у ходзе праведзенай размовы кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі асобным блокам.**

**Яшчэ адна тэма на парадку дня — сумесная работа і напрамкі супрацоўніцтва за мяжой, за межамі Саюзнай дзяржавы. Узгаднілі прэзідэнты Беларусі і Расіі і графік далейшых кантактаў. Аляксандр Лукашэнка таксама павіншаваў Уладзіміра Пуціна з Днём Расіі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі:**

*«Давайце скажам шчыра, што ўзровень прававой культуры нашых грамадзян дастаткова высокі. Ва ўсякім разе, у галіне выбарчага права, бо сама яўка выбаршчыкаў гаворыць пра гэта. Калі грамадзяне не вераць у выбарчую сістэму, то і яўкі нізкія, як у некаторых краінах праходзілі цяпер выбары. Дарэчы, у еўрапейскіх, якія нас любяць павучаць, асабліва нашы найбліжэйшыя суседзі, якія з другога тура выбіраюць прэзідэнта. І фактычна мы бачым, якая яўка выбаршчыкаў — там не давяраюць выбарчай сістэме. Наша яўка выбаршчыкаў на працягу больш як 30 гадоў суверэннага развіцця паказвае, што цікавасць нашых грамадзян да выбараў ёсць».*

# Першы ўкос



Фота БелТА.

**Галоўны аграном ААТ «Маслакі» Горацкага раёна Сяргей ШЫРАКОЎ якасцю травяністых кармоў задаволены.**

Экалогія

## ДА АДХОДАЎ — З НОВЫМ ПАДЫХОДАМ

**Агульная плошча звалак у Беларусі займае каля 4 тысяч гектараў. Гэта досыць вялікая тэрыторыя для нашай краіны. У найбліжэйшыя гады ўрад плануе пабудаваць 30 рэгіянальных смеццеперапрацоўчых заводаў. Гэтыя прадпрыемствы ствараюцца з мэтай пераходу ад захоўвання адходаў да іх максімальнай перапрацоўкі, адзначыла загадчык аддзела абыходжання з адходамі Рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства «Бел НДЦ «Экалогія» Кацярына БАЦЯН.**

СТАР. 3



Фота «Мінск-навіны».

Запрашальнік

## МЕЛОДЫІ СЭРЦА — У МАЛАДЗЕЧНЕ

**Сёлета XXIII Нацыянальны фестываль песні і паэзіі ў Маладзечне пройдзе чарговы раз 14 і 15 чэрвеня. Гасцей і ўдзельнікаў маштабнага свята чакае насычаная праграма: запланавана правядзенне звыш 60 разнапланавых мерапрыемстваў для рознаўзроставай аўдыторыі. Знайсці сабе адпачынак па душы зможа кожны. На сустрэчы з журналістамі арганізатары і ўдзельнікі свята расказалі пра яго акцэнты і адметнасці.**

— Зберажэнне, развіццё і папулярызацыя нацыянальнай культуры, роднай мовы, літаратуры сёння з'яўляюцца адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці ўстаноў культуры краіны. Культурная супольнасць рэалізоўвае шэраг мерапрыемстваў у рамках Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства, — адзначыла **кансультант упраўлення прафесійнага мастацтва галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Алена ТАЛПЕКА.** — Сярод фестывальных мерапрыемстваў краіны менавіта Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі — тое мерапрыемства, якое ў поўнай меры адпавядае асноўным кірункам канцэпцыі і адлюстроўвае магчымасці нацыянальнай культуры, яе ўнікальныя асаблівасці і дасягненні ў прафесійным мастацтве і аматарскай творчасці. Гэты ўнікальны фестываль ужо звыш 20 гадоў аб'ядноўвае майстэрства вядомых артыстаў, паэтаў, кампазітараў і талент прадстаўнікоў маладога пакалення.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Узаемны інтарэс

# Падабенства пазіцый і падтрымка

## Наталля КАЧАНАВА правяла рабочую сустрэчу з дэлегацыяй Кубы

**Дэлегацыя на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Куба Рыкарда Кабрысасам Руісам гэтымі днямі наведвае Беларусь: у нашым знешнепалітычным ведамстве адбылося 11-е пасяджэнне беларуска-кубінскай сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Напярэдадні перспектывы супрацоўніцтва паміж краінамі абмеркавалі і ва ўрадзе, на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам.**

Вітаючы гасцей у Савеце Рэспублікі, Наталля Качанава адзначыла, што беларускі бок рады інтэнсіўнасці візітаў дэлегацый абедзвюх краін, і нагадала, што на чарговым пасяджэнні міжурадавай камісіі абмяркоўваліся далейшыя перспектывы супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі. «Беларусь і Кубу звязвае вельмі цеснае сяброўства, нягледзячы на далёкую адлегласць, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Вядома, шмат у чым гэта заслуга нашых лідараў, кіраўнікоў нашых краін. Тыя пагадненні, якія дзейнічаюць паміж Беларуссю і Кубай, даюць сёння свае вынікі».

Кажучы аб міжнароднай абстаноўцы, спікер звярнула ўвагу на тое, што Беларусь прытрымліваецца абсалютна падобных пазіцый. «Нашы краіны робяць усё для таго, каб захаваць свой суверэнітэт і незалежнасць, і мы ўдзячныя вам за падтрымку на міжнародных пляцоўках і ў міжнародных арганізацыях, — канкрэтызавала Наталля Качанава. — Мы заўсёды падтрымлівалі Кубу ў імкненні быць незалежнай, самастойнай дзяржавай. Хачу адзначыць, што мы прынялі заяву Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па зняцці санкцый з Кубы. Мы разумеем, наколькі гэта сур'ёзна. У гэтай сітуацыі сёння знаходзіцца Беларусь. Да нас ужытыя санкцыі, і мы дакладна так робім усё для таго, каб захаваць суверэнітэт і незалежнасць сваёй краіны».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

Міжнародны вектар

# З акцэнтам на парламенцкае вымярэнне

## Завяршыўся афіцыйны візіт азербайджанскай парламенцкай дэлегацыі ў Беларусь

**У апошні дзень візіту адбылася сустрэча Старшыні Мілі Меджліса Азербайджанскай Рэспублікі Сагібы ГАФАРАВАЙ і прэм'ер-міністра нашай краіны Рамана ГАЛОЎЧАНКІ. Акрамя таго, дэлегацыя наведала Нацыянальную бібліятэку Беларусі і «Першы нацыянальны гандлёвы дом».**

Як адзначыў падчас сустрэчы са спікерам парламента Азербайджана Раман Галоўчанка, апошнія месяцы па праве можна назваць месяцамі беларуска-азербайджанскага супрацоўніцтва. Кіраўнік беларускага ўрада падкрэсліў, што візіт Сагібы Гафаравай вельмі важны і каштоўны, бо так званае парламенцкае вымярэнне набірае ўсё большыя абароты. «Мы бачым у вашым візіце важны момант для ўмацавання беларуска-азербайджанскага сяброўства і з вялікай цеплынёй і ветлівасцю прымаем вас у нашай краіне», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Па словах прэм'ер-міністра, пазіцыя парламента вельмі важная для грамадства. Ён падкрэсліў, што гэта правільныя сігналы для бізнесу і для афіцыйных асоб.

Па словах Старшыні Мілі Меджліса, пашырэнне гандлёва-эканамічных сувязяў заканамернае як для Беларусі, так і Азербайджана. «Нас многае звязвае, нашы краіны не толькі захоўваюць наладжаныя гандлёва-эканамічныя адносіны, але і развіваюць іх», — удакладніла яна.

Азербайджанскую парламенцкую дэлегацыю ў Нацыянальнай бібліятэцы суправаджалі Наталля Качанава і кіраўнік установы Вадзім Гігін. Госці азнаёміліся з выстаўкай кніг з фонду бібліятэкі, прысвечаных Азербайджану і напісаных аўтарамі гэтай краіны. Вадзім Гігін правёў для членаў дэлегацыі экскурсію па Музеі кнігі, падчас якой расказаў аб рэдкіх экзэмплярах, якія па праве лічацца нацыянальным культурным здабыткам.

Сагіба Гафарава пакінула запіс у Кнізе ганаровых гасцей Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Спікеру падарылі кнігу аб героях-абаронцах Беларусі, якія з'яўляюцца ўраджэнцамі Азербайджана, і беларускую дзіцячую кнігу аб гэтай краіне.

З прадукцыяй беларускіх вытворцаў азербайджанскія парламентарыі маглі азнаёміцца будучы ў «Першым нацыянальным гандлёвым доме», дзе прадстаўлены найлепшыя айчынныя брэнды. На пляцоўцы гандлёвага дома адбылася дэманстрацыя мадэляў адзення беларускіх вытворцаў, дэгустацыя харчовых навінак.

«Мы сёлета падпісалі пабрацімства з Баку, — расказала **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ**. — Таму, вядома, нашы тавары, якія выраблены ў Рэспубліцы Беларусь, у горадзе Мінску павінны прысутнічаць максімальна на рынку Азербайджана. Абмеркавалі ў тым ліку тэму інвестыцый. Азербайджанскі бізнес у гэтым зацікаўлены. Тут вельмі шмат можна развіць у часткі вялікага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў. Таму абмеркавалі і гэтае пытанне. І, вядома ж, ужо крыху сталі абмяркоўваць тэму жаночага бізнес-форуму, які, спадзяюся, пройдзе ў найбліжэйшы час у Баку. Нас ужо запрасілі. Таму будзем фарміраваць нашых жанчын актыўных, паедзем паказваць і расказваць пра нашы магчымасці».

**Старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА** паведаміла, што ў рамках візіту парламенцкай дэлегацыі Азербайджана хацелася максімальна паказаць магчымасці і патэнцыял нашай краіны. «Абмяркоўваліся вектары магчымага супрацоўніцтва, вядома, ёсць пэўныя дамоўленасці, — адзначыла яна. — Думаю, што ўсё ў нас атрымаецца па гандлёвай кааперацыі, па маштабаванні прадстаўлення нашай беларускай прадукцыі, асабліва ўнікальнай. Гэта нашы вырабы з лёну, хатні тэкстыль, адзенне, дзелавыя касцюмы, нават посуд, які мы сёння паказвалі».

Як адзначыў у размове з журналістамі **кіраўнік рабочай групы па міжпарламенцкіх сувязях «Азербайджан — Беларусь» Зіяд САМЕДЗАДЭ**, вопыт Беларусі заслугоўвае самых станоўчых ацэнак. «Мы падрабязна аналізавалі па працягу некалькіх гадоў дынаміку эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Вельмі рады, што ў Беларусі і Азербайджана вельмі добрыя, дынамічныя адносіны. У вас высокаразвітая прамысловасць. Мы павінны вельмі правільна і ўпэўнена выкарыстоўваць беларускі вопыт у захаванні і развіцці прамысловасці», — сказаў ён.

Кажучы аб перспектывах двухбаковага ўзаемадзеяння ў эканамічнай сферы, азербайджанскі парламентарый звярнуў увагу і на важнасць вызначэння шляхоў далейшага развіцця міжпарламенцкіх адносін.

**Вераніка КАНЮТА.**

Глабальны кантэкст

# ТАЙНА ДВУХ АКІЯНАЎ



## Які інтарэс Захаду ў Інда-Ціхаакіянскім рэгіёне

**Ні для каго не сакрэт, што механізм перабудовы свету, запушчаны ў XXI стагоддзі, толькі набірае абароты. Пры гэтым цэнтр сілы паслядоўна зрушваецца ў Азіяцкім напрамку. Невыпадкова лідары большасці вядучых дзяржаў свету з зайздросным пастаянствам наведваюць Кітай, Індыю, Малайзію, Пакістан, Філіпіны, В'етнам і іншыя краіны рэгіёна. Усведамленне значнасці Азіі для сусветнага эканамічнага развіцця абумоўлівае павышэнне цікавасці да яе і інтэнсіфікацыю запыту на бяспеку з боку азіяцкіх дзяржаў. У сувязі з гэтым не з'яўляецца выключэннем і візіт у Манголію афіцыйнай беларускай дэлегацыі на чале з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам.**

Значнасць Азіяцкага рэгіёна ў будучым светаўладкаванні знайшла адлюстраванне ў шэрагу кіруючых дакументаў ЗША і НАТА. У Стратэгіі нацыянальнай бяспекі (СНБ) ЗША 2017 года былі рэалізаваны ідэі канца халоднай вайны ў часткі забеспячэння перавагі ЗША над усімі астатнімі дзяржавамі свету. У дакуменце канстатавалася, што «адбылося неспрыяльнае для амерыканскіх інтарэсаў зрушэнне глабальнага балансу сіл», і ў якасці канчатковай мэты вызначалася аднаўленне паступальнай дынамікі Амерыкі, нівеліраванне негатыўных тэндэнцый, падтрыманне парадку, які ўстанавіўся пасля Другой сусветнай вайны.

У тэксце СНБ гаварылася аб тым, што «асноўная праблема для нацыянальнай бяспекі ЗША не тэрарызм, а міждзяржаўнае стратэгічнае саперніцтва. Амерыканская армія не валодае неаспрэчнай перавагай на полі бою, а гэта значыць, што мы вяртаемся да класічнай мадэлі міжнародных адносін і традыцыйных мэт прагматычнай палітыкі». Сярод пагроз Амерыцы названы ізгоі, рэвізіяністы і тэрарысты. Першыя «пагражаюць сваім суседзям зброяй масавага паражэння і дэстабілізуюць важныя рэгіёны», а другія «хочуць стварыць свет, які не адпавядае амерыканскім інтарэсам і каштоўнасцям». У катэгорыю краін-рэвізіяністаў уключаны Расія і Кітай. Менавіта іх дзейнасць «з'яўляецца выклікам магутнасці, уплыву і інтарэсам Амерыкі і накіравана на падрыў яе бяспекі і прыпыненне росквіту». Для эфектыўнай рэалізацыі планаў захавання ўласнай гегемоніі ў жніўні 2017 года ЗША быў прыняты Закон «Аб супрацьдзеянні сапернікам Амерыкі праз санкцыі».

Дадатковымі фактарамі, якія ўплываюць на развіццё геастратэгічнай абстаноўкі ў Азіяцкім рэгіёне, з'явіліся намаганні ЗША па стварэнні новых і рэанімацыі існуючых ваенна-палітычных альянсаў AUKUS і QUAD. Першы 15 верасня 2021 года аб'яднаў Аўстралію, Вялікабрытанію, ЗША ў Інда-Ціхаакіянскім рэгіёне. Другі, створаны ў 2007 годзе, анансаваны як «азіяцкі НАТА», уключыў Аўстралію, Індыю, ЗША, Японію ў працэс стрымлівання стратэгічнай экспансіі Кітая. Менавіта ў трэцім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя QUAD пачаў актыўна нарошчваць сваю актыўнасць. У наяўнасці зрушэнне акцэнтаў знешняй палітыкі Вашынгтона ў Ціхаакіянскі рэгіён і на супрацьстаянне Пекіну.

Характэрна, што ў стратэгіі НАТА 2022 года ўпершыню ў гісторыі ў якасці выкліку інтарэсам, бяспецы і каштоўнасцям Паўночнаатлантычнага саюза названа палітыка, якая рэалізоўваецца Кітаем. Паводле Стратэгіі, КНР «імкнецца падарваць заснаваны на правілах міжнародны парадак, у тым ліку ў касмічнай, кібернетычнай і марской сферах». Не дзіўна, што менавіта Кітаем сістэмнае саперніцтва з Кітаем абвяшчаецца «стратэгічным вектарам НАТА на сярэднетэрміновую перспектыву», а Інда-Ціхаакіянскі рэгіён прызнаны важным для еўрапейскай бяспекі. Так і хочацца ўдакладніць: дзе НАТА, а дзе такі важны для яго раён свету?

Не выклікае сумненняў, што такая пільная ўвага Вашынгтона і Брусэля да разгледжанага рэгіёна не абяцае нічога добрага краінам, якія ў яго ўваходзяць. Ужо сёння дзяржавы вымушаны істотна павялічыць уласныя выдаткі на абарону, а Кітай, Індыя і Японія ўваходзяць у лік лідараў па аб'ёмах фінансавання сферы нацыянальнай бяспекі. Паўднёвая Карэя, Японія, Філіпіны з'яўляюцца партнёрамі, а збольшага і сатэлітамі ЗША, якія іх падтрымліваюць. Штотыдзень у СМІ з'яўляецца інфармацыя аб сумесных вучэннях, заявах, выпрабаваннях, інцыдэнтах. Сур'ёзным ачагом напружанасці працягвае заставацца Паўднёва-Кітайскае мора, найважнейшы транзітны шлях рэгіёна, і востраў Тайвань.

Масла ў агонь падліваюць ЗША, размяшчаючы мабільныя пускавыя ўстаноўкі Typhon («Тыфон») на Філіпінах. Гэтыя ракетныя комплексы сярэдняй далёкасці (да 1800 км) з ракетамі Tomahawk і SM-6 здольны кантраляваць не толькі ўвесь Лусонскі праліў, але і частку кітайскага ўзбярэжжа, а таксама базы Народна-вызваленчай арміі Кітая ў Паўднёва-Кітайскім моры. Пры падтрымцы Вашынгтона ідзе мілітарызацыя Тайваня, Японіі, Паўднёвай Карэі.

У гэтых умовах практычна ні адна дзяржава рэгіёна не застрахавана ад дэструктыўнага знешняга ўздзеяння. Не з'яўляецца выключэннем і Манголія, геаграфічна размешчаная паміж магутнымі імперыямі — Расіяй і Кітаем, якія з'яўляюцца сапернікамі ЗША. Стварыць ім праблемы — найважнейшая геапалітычная задача Вашынгтона, якую ён вырашае ўсімі даступнымі метадамі. Не выклікае сумнення, што ў найбліжэйшай перспектыве Манголія будзе вымушана канчаткова вызначыцца з уласным курсам развіцця, што можа ініцыяваць спробы знешняга маніпулявання.

Існуючы ў Беларусі патэнцыял у сферы забеспячэння палітычнай бяспекі, процідзеяння «каляровым» рэвалюцыям, эканамічнай, харчовай, тэхналагічнай бяспекі можа быць запатрабаваны Улан-Батарам. У той час, калі свет увайшоў у стадыю геапалітычнай турбулентнасці, надзейныя саюзнікі — гэта адна з умоў захавання нацыянальнага суверэнітэту і незалежнасці, што дакладна ўсведамляюць у рэгіёне.

Наша краіна мэтанакіравана выбудоўвае сяброўскія адносіны з Расіяй, Кітаем, Індыяй, В'етнамам, іншымі вядучымі гульцамі рэгіёна. Манголія, пераканаўшыся ў партнёрскай надзейнасці Беларусі, якасці нашай прадукцыі і паслядоўнасці беларускай палітыкі, прыняла рашэнне аб пашырэнні спектра міждзяржаўнага ўзаемадзеяння, аб чым сведчаць вынікі афіцыйнага візіту. Падпісаны шэраг міжурадавых пагадненняў і дамоўленасцяў.

У найбліжэйшай перспектыве размова можа ісці аб падрыхтоўцы кадраў (а гэта процідзеянне «мяккай сіле»), пастаўках беларускай тэхнікі (а гэта тэхналагічны суверэнітэт), развіцці кантактаў у галіне сельскай гаспадаркі, што забяспечыць эканамічны рост і сацыяльную стабільнасць. У якасці перспектыўнага кірунку двухбаковага супрацоўніцтва трэба разглядаць ваенна-тэхнічную сферу. Беларусь гатова дзяліцца сваімі напрацоўкамі ў гэтай галіне, і ёй ёсць што прапанаваць мангольскім калегам. Гэта пажарна-ратавальная тэхніка, шырокая лінейка сродкаў кіравання і сувязі, іншыя ўзоры.

Мы, беларусы, дакладна ўсведамляем свае магчымасці і ідзём туды, дзе нашы кампетэнцыі запатрабаваны. Галоўны трэнд нашай знешняй палітыкі — раўнапраўны, узаемавыгадны дыялог, што ў поўнай меры адпавядае духу новага шматпалярнага свету, які фарміруецца сёння. Гэта з кожным днём усведамляюць усё больш краін, якія на практыцы рэалізоўваюць геапалітычны запавет З. Бжэзінскага: «Аднаасобнае панаванне нават самай моцнай дзяржавы ўжо немагчыма, асабліва ўлічваючы з'яўленне новых рэгіянальных гульцоў».

Падобныя стратэгічныя трансфармацыі вельмі складаныя і часта суправаджаюцца войнамі і ўзброенымі канфліктамі. Адпаведна, ва ўсіх кутках планеты расце запыт на бяспеку, а Рэспубліка Беларусь можа прапанаваць сваім сябрам і партнёрам інструментарый для яе забеспячэння. Словы нашага Прэзідэнта аб тым, што «Беларусь ідзе з дабром і ўзаемавыгаднымі прапановамі», сталі лейтматывам знешняй палітыкі краіны. Сёння паслядоўна пашыраюцца азіяцкі, афрыканскі, блізкаўсходні вектары нашага супрацоўніцтва, робячы нашы пазіцыі на міжнароднай арэне мацнейшымі, а кола нашых партнёраў — шырэйшым.

**Мікалай БУЗІН, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, прафесар.**

Блізкая ўлада

# «Бачыць зрэз надзённых праблем»

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН правёў асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію. Да кіраўніка вобласці звярнуліся 28 чалавек.**



Жыхарка горада Віцебска адпрацавала на ААТ «Віцебскія дываны» 32 гады, падчас выхаду на пенсію ў 2014 годзе не атрымала выхадную дапамогу, прадугледжаную калектыўным дагаворам. Прадстаўнікі прадпрыемства, якія прысутнічалі на прыёме грамадзян, адзначылі, што ў той перыяд выхадную дапамогу пры звальненні выплачвалі толькі пры адсутнасці дысцыплінарных парушэнняў за ўвесь перыяд работы, а ў заяўніцы ў 1991 годзе значыцца вымова за прагул. Цана пытання на сённяшні дзень — прыкладна 1200 рублёў. Аляксандр Субоцін, выслухаўшы ветэрана працы, папрасіў кіраўніцтва «Віцебскіх дываноў» больш дакладна вывучыць пытанне і па магчымасці дапамагчы былой работніцы, тым больш што і парушэнне за тры дзесяцігоддзі ўжо страціла сваю сілу. «Але трэба быць уважлівымі падчас прапрацоўкі пытання і калектыўнага дагавора, каб не адкрыць скрыню Пандоры», — зазначыў ён.

Вялікай дэлегацыяй на прыём да старшыні аблвыканкама прыйшлі прадстаўнікі таварыства ўласнікаў з дома № 8 па вуліцы Працы абласнога цэнтра. Не першы раз людзі звяртаюцца ў розныя інстанцыі, каб дом, пабудаваны чатыры гады таму, прывялі ў безаварыйны стан. Пры будаўніцтве былі дапушчаны памылкі, з некаторымі дом увялі ў эксплуатацыю, праз што цяпер пакутуюць людзі: патрабуюць умацавання фасадаў і балконаў. Канфлікт з плоскасці тэхнічнай перайшоў у плоскасць міжасобаснаю паміж будаўнікамі і жыхарамі. Кіраўнік вобласці падкрэсліў, што ў такіх пытаннях людзі і прадстаўнікі адзінай арганізацыі павінны дзейнічаць адзіным арганізмам, і даў даручэнне ліквідаваць праблему да лістапада.

Жыхар пасёлка Копысь Аршанскага раёна спачатку падзякаваў старшыні за дапамогу ў вырашэнні пытання са спартзалай. Пасля гэтага мужчына дадаў, што многія аднавяскоўцы вельмі хацелі б аднавіць мясцовую пякарню, якая была зачынена некалькі гадоў таму. Па словах заяўніка, хлеб там пяклі адмысловы, які карыстаўся попытам у насельніцтва, а цяпер будынак руйнуецца. Яшчэ мужчына адзначыў, што для замацавання маладых кадраў у Копысі не хапае жылля, таму папрасіў дапамогі ў перадачы будынка былога лясніцтва ў жылы фонд. Заяўнік падкрэсліў, што патрабуе рамонту і будынак цэнтра народнай творчасці. Аляксандр Міхайлавіч адказаў, што кожны з пунктаў звароту будзе прапрацаваны і мужчыну дадуць адказ.

Напрыканцы сустрэчы да губернатара звярнуліся людзі, якія набылі ўчастак пад будаўніцтва ў мікрараёне Біцялёва. На момант набыцця зямельнага ўчастка ніякай інфраструктуры ў мікрараёне не было, пакуль заяўнікі чакалі лепшага, у верасні бягучага года ўжо выходзіць тэрмін будаўніцтва, і ўчастак могуць забраць. Мужчыны папрасілі кіраўніка вобласці дапамагчы падоўжыць тэрмін, бо людзі плануюць ужо заліваць фундамент і ўзводзіць сцены. Аляксандр Міхайлавіч даручыў камітэту па архітэктуры і будаўніцтве дэталёва разгледзець пытанне.

Падводзячы вынікі асабістага прыёму грамадзян, старшыня аблвыканкама падкрэсліў, што большасць праблем павінна вырашацца на месцах. «Калі кожны будзе выконваць сваю працу добра, пачынаючы ад будоўлі, рамонту і заканчваючы навядзеннем парадку, — не будзе праблем. Але ёсць і пытанні, якія патрабуюць больш уважлівага разгляду з боку вышэйшых службовых асоб. Як правіла, сюды заходзяць людзі, якія ўперліся альбо ў заканадаўчую сцяну, альбо так склаліся абставіны, што немагчыма вырашыць пытанне па-простаму. Тады даводзіцца прымаць неардынарныя рашэнні. Але каму трэба дапамагчы — мы дапамагаем», — заключыў Аляксандр Міхайлавіч.

На прамую тэлефонную лінію, якая адбылася ў іншы дзень, першым звярнуўся жыхар Віцебска, які падзякаваў кіраўніцтву вобласці і горада за тую вялікую работу, што апошнім часам праводзіцца па паляпшэнні сацыяльнай сферы. Аляксандр Субоцін, у сваю чаргу, падзякаваў за высокую ацэнку працы ўлады і агучыў мэту — зрабіць Віцебшчыну найлепшым рэгіёнам у Беларусі.

Пра сваю шматгадовую праблему кіраўніку вобласці распавялі віцябчане, якія пражываюць у шматкватэрных дамах № 116, 114, 108 на праспекце Фрунзэ. Дому № 116 не больш за 28 гадоў, але ён патрабуе дбайнай праверкі: працякае пасля вялікіх ападкаў, прамярзае ў халодную пару года, знасілася пакрыццё даху, у склепе пастаянна стаіць вада, пачынае асыпацца фундамент. Аляксандр Субоцін узяў гэта пытанне на кантроль і даручыў неадкладна правесці праверку стану будынкаў спецыялістам галоўнага ўпраўлення ЖКГ аблвыканкама.

Жыхарка Лукомля Чашніцкага раёна папрасіла не арганізоўваць базу па перапрацоўцы і сартаванні бытавых адходаў у аграгарадку, гэта пытанне вырашылася адразу з мясцовымі ўладамі, а вось над станам дарог, на які заяўніца таксама звярнула ўвагу, яшчэ трэба папрацаваць.

Жыхары вуліц Праўды і Лакматыўнай горада Віцебска распавялі, што не заўсёды ў іх кватэрах ёсць гарачая вада. У першым выпадку вада не даходзіць канкрэтна ў ванную, у другім ёсць праблемы з цеплаабменнікам. Работнікі водаканала пра гэта ведаюць, але пакуль выніку іх працы няма. У доме № 24 па вуліцы Міру цячэ ржавая вада. «Агучаныя праблемы агалілі нашы недапрацоўкі. Нямала зроблена на Віцебшчыне ў рамках выканання праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», але ўсё роўна застаюцца нейкія недахопы. Пастараемся ў самыя кароткія тэрміны іх выправіць», — паабяцаў начальнік галоўнага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі аблвыканкама Юрый Дзядзёла.

Чарговы заяўнік распавёў, што выхоўвае 10-гадовае дзіця з інваліднасцю і ў пад'ездзе іх дома па праспекце Чарняхоўскага жыццёва неабходны пандус. Раней сям'я ўжо звярталася да адпаведных службаў з гэтым пытаннем, але атрымала адказ, што ўладкаванне пандуса ў дадзеным выпадку не ўяўляецца магчымым. Па даручэнні Аляксандра Субоціна спецыялісты профільных ведамстваў правядуць агляд пад'езда на бягучым тыдні.

Усяго на прамую лінію да кіраўніка Віцебшчыны звярнуліся 24 чалавекі з Віцебска, Паставаў, Полацка, Оршы, Сянно, Гарадка, Чашніцкага і Полацкага раёнаў. Пытанні датычыліся работы сферы ЖКГ, землеўладкавання, рамонту дарог, працаўладкавання.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

# ДА АДХОДАЎ — З НОВЫМ ПАДЫХОДАМ

## Ствараецца 30 пляцовак, дзе адходы будуць перапрацоўвацца цалкам

### НЕПАЗБЕЖНЫЯ ПРАДУКТЫ

Як высветлілі спецыялісты, найбольшая колькасць адходаў утвараецца ў Мінскай і Магілёўскай абласцях, а таксама ў сталіцы. Яны ўтвараюцца і назапашваюцца ад усіх сектараў эканомікі і звычайна разглядаюцца як непазбежныя прадукты.

Як правіла, яны звязаны з недастатковасцю тэхналагічных працэсаў, нізкім тэрмінам службы тавараў, а таксама экалагічна цяжкім характарам спажывання, лічыць Кацярына Бацян. У нашай краіне рэалізоўваецца эфектыўная палітыка ў галіне абыходжання з адходамі і штогод пераглядаюцца нарматыўна-прававыя акты. Гэтага патрабуюць і сектар прамысловай вытворчасці, які развіваецца, і сістэма ў галіне абыходжання з адходамі ў свеце, адзначае спецыяліст.

Дзякуючы дзяржаўнай эфектыўнай палітыцы абыходжання з адходамі ў Беларусі павялічваецца колькасць аб'ектаў, якія прымаюць іх на абясшкоджванне, а таксама прадухіляюць трапленне таксічных адходаў у прыроднае асяроддзе.

Па рэгіёнах у стварэнні адходаў лідзіруе Мінская і Магілёўская вобласці, але больш за ўсіх працуе на сметнік горад Мінск, які штогод «выкідвае» горы непатрэбных рэчаў, або каля 17 % ад усіх адходаў краіны. «Што датычыцца структуры, то больш за 50 % — гэта тавары мінеральнага паходжання, далей — раслiннага і жывёльнага (20 %), адходы ападкаў сцёкавых вод водападрыхтоўкі кацельна-цеплавой гаспадаркі (12 %), медыцынскія (менш за 1 %)», — адзначыла Кацярына Бацян.

Варта адзначыць, што ў мінулым годзе аб'ём утварэння адходаў вытворчасці без уліку буйнатаннажных скараціўся на 3 мільёны тон у параўнанні з мінулымі перыядамі. «Гэта значыць, што ўсё больш адходаў у краіне трапляе ў гаспадарчы абарот. У нас больш за тысячу юрыдычных асоб, на балансе якіх маюцца аб'екты па выкарыстанні адходаў — як уласных, так і тых, што прымаюцца ад іншых арганізацый для атрымання новага прадукту. Усяго ж у краіне зарэгістравана больш за 1,5 тысячы аб'ектаў, дзе вядзецца перапрацоўка тысячы найменняў адходаў (пры 1,5 тысячы найменняў, што ўтвараюцца)», — расказала Кацярына Бацян.

Сёлета класіфікатар адходаў у Беларусі быў актуалізаваны. Паводле слоў спецыяліста, на сёння актуальнае і пытанне размяшчэння адходаў. У нашай краіне ёсць дастаткова вялікая колькасць санкцыянаваных месцаў размяшчэння розных адходаў, уключаючы плошчы 151 палігона камунальных адходаў, 12 прамысловых, 52 штаманазапашвальнікаў, а таксама 123 глеістых пляцовак, попелаадвалаў. Каб вырашыць праблему шкоды, якую наносяць гэтыя аб'екты, рэалізоўваецца палітыка ў частцы стварэння рэгіянальных комплексаў па выкарыстанні, пахаванні і абясшкоджванні адходаў. Менавіта будаўніцтва такіх комплексаў дазволіць скараціць аб'екты доўгачасовага захоўвання адходаў і сканцэнтраваць магутнасці на рэгіянальных пунктах перапрацоўкі.

### СМЕЦЦЕ Ў ДВА КАНТЭЙНЕРЫ

Пачаўся пілотны праект па зборы смецця ў трох раёнах сталіцы. Пра гэта расказала **намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Анастасія ВАРАБ'ЁВА.**

Адходы ў сталіцы збіраюцца кантэйнерным спосабам. У шматкватэрнай забудове збор другаснай сыравіны ажыццяўляецца паводле схемы ў тры кантэйнеры (для паперы і кардону, шкла, пластыку), у прыватнай — у адзін кантэйнер аб'ёмам 120 літраў.

У Мінску прадпрыемствам «Рэмандзіс Мінск» рэалізоўваецца пілотны праект у Кастрычніцкім, Маскоўскім і Фрунзенскім раёнах у частцы прымянення двухкантэйнернай сістэмы збору адходаў. Пілотны праект прадугледжвае збор цвёрдых камунальных адходаў у асобны кантэйнер чорнага колеру, а адходы ўпакоўкі і тары (шкло, папера, метал) збіраюцца ў асобны кантэйнер жоўтага колеру або з жоўтай накрыўкай.

«Характэрна, што эксперымент паказаў станоўчы вынік. Такая сістэма больш зразумелая людзям, і працэнт выбаркі павялічыўся да 30 %. Таксама дадаткова ў якасці эксперымента былі ўстаноўлены антывандальныя кантэйнеры для збору шкла аб'ёмам 3,2 кубічныя метра, якія дазволілі знізіць выдаткі на сартаванне. Штогод са 100 кантэйнераў у гэтых раёнах збіраецца да 150 тон чыстай фракцыі шкла», — адзначыла Анастасія Вараб'ёва.

Усе адходы раздзельнага збору, якія збіраюцца ў жылым сектары, потым вязуць на сартаванне на спецыялізаваныя вытворчасці. Па выніках эксперымента будзе прынята рашэнне аб рэалізацыі двухкантэйнернай схемы ў астатніх раёнах Мінска. Як адзначыла спецыяліст, летась працэнт выкарыстання адходаў у сталіцы склаў 38,7 %.

### ПАВЯЛІЧЫЦЬ МАГУТНАСЦІ СПЕЦЫЯЛЬНАГА ЗАВОДА

Намеснік гендырэктара нагадала, што ў Мінску ў раёне палігона «Трасцянецкі» працуе смеццесартавальны і смеццеперапрацоўчы завод, куды і звозяцца бытавыя адходы. Таксама задзейнічана пяць сартавальных ліній на прадпрыемстве «Экарэс» і адна сартавальная лінія на прадпрыемстве «Рэмандзіс Мінск».

Сёлета пачаты будаўнічыя работы па павелічэнні магутнасцяў завода. Будаўніцтва гэтага аб'екта плануецца завяршыць да чэрвеня наступнага года і запусціць прадпрыемства на поўную магутнасць. Глабальная рэканструкцыя завода дазволіць павялічыць магутнасці завода да 600 тысяч тон у год. Усе адходы ў Мінску будуць накіроўвацца на гэты завод, адсартоўвацца другасныя матэрыяльныя рэсурсы. Таксама на заводзе будуць перапрацоўвацца буйнагабарытныя адходы і выраблядца RDF-паліва ў аб'ёме 114 тысяч тон у год (refuse-derived fuel — паліва, атрыманае з адходаў), у першую чаргу для патрэб цэментнай галіны Беларусі. Пасля гэтага ўсё смецце, якое ўтвараецца Мінскам, будзе не складавацца на звалках, а перапрацоўвацца.

### НЕ ХОЧАШ САРТАВАЦЬ — ПЛАЦІ

На жаль, не ўсе людзі ў нас яшчэ свядомыя. Але большасць грамадзян усё ж сартуе свае адходы перад тым, як іх выкідваць. Айчыннае заканадаўства прапаноўвае падштурхоўваць такіх людзей да належных экалагічных дзеянняў праз перакананне і пакаранне парушальнікаў. **Начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Вольга САЗОНАВА** паведаміла, што парушэнні заканадаўства ў сферы абыходжання з адходамі апісаны ў Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях. Напрыклад, для юрыдычных асоб штраф складае да 1000 базавых велічынь. Таксама прадугледжана пакаранне і для фізічных асоб. Іх можна прыцягнуць да адказнасці, калі не забяспечаны раздзельны збор адходаў у выпадках, калі для гэтага створаны ўмовы. Калі, напрыклад, было зафіксавана, што ў кантэйнер для пластыку былі выкінуты змешаныя адходы. За гэта можна атрымаць штраф да 30 базавых велічынь (1200 рублёў).

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вернісаж

# ПАРТРЭТЫ І ЛЁСЫ

## Учора ў Палацы Незалежнасці адкрылася выстава вядомага жывапісца, Героя Працы Расіі, народнага мастака СССР Аляксандра ШЫЛАВА



Фота Яны ВАЛАСАЧ.

**У экспазіцыі, якая адкрылася акурат у Дзень Расіі, прадстаўлены 33 жывапісныя творы майстра, якія адрозніваюцца глыбінёй псіхалагізму, жыццёвай дакладнасцю і ўнутранай праўдай характару. Асноўнае месца займаюць партрэты людзей з няпростым лёсам і жыццём: удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, свяшчэннаслужыцеляў, дзеячаў культуры, спорту і іншых. За іх плячыма — вопыт цэлага пакалення.**

**Першы намеснік міністра культуры Валерый ГРАМАДА**, які прысутнічаў на адкрыцці, падзякаваў аўтару работ за ініцыятыву і рэалізацыю выставы, а таксама адзначыў, што беларусам выдалася цудоўная магчымасць — пабачыць на свае вочы прафесійнае майстэрства Аляксандра Шылава спачатку ў Палацы Незалежнасці, а пасля яшчэ і ў Нацыянальным мастацкім музеі.

— Гэтая выстава выклікае шырокі грамадскі рэзананс і стане яркай падзеяй у жыцці нашай краіны, — запэўніў Валерый Грамада.

**Генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Ганна КОНАНАВА** адзначыла, што гэты выставачны праект, асоба аўтара і тыя ідэі, якія ўзнімаюцца, сведчаць пра дружбу і моцную сувязь паміж народамі Беларусі і Расіі:

— Галерэя партрэтаў, якую мы назіраем сёння ў Палацы Незалежнасці, — гэта моцнае творчае, мастацкае і сацыяльнае выказванне, — адзначае Ганна Конанава. — Ідэя і канцэпт ролі асобы ў гісторыі становяцца вельмі актуальнымі і ў вобразах тых, хто адлюстраваны ў работах аўтара, гэта асабліва заўважна.

«Я вельмі ганаруся тым, што маю магчымасць выставіць свае работы ў Палацы Незалежнасці, — сказаў сам Аляксандр Шылаў. — За гэта дзякую кіраўніцтву Беларусі, Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку».

Свае работы вядомы мастак ужо цяпер падарыў дзяржаве, Расіі. Гэты грамадзянскі і патрыятычны ўчынак, дарэчы, з'яўляецца ўнікальным. Яго жыццё ў творчасці — прыклад для многіх, як трэба служыць Радзіме, людзям.

**Яна ВАЛАСАЧ.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

# МЕЛОДЫІ СЭРЦА — У МАЛАДЗЕЧНЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Арганізатары фестывалю — Міністэрства культуры, Мінскі аблвыканкам, Маладзечанскі райвыканкам, Белтэлерадыёкампанія, Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі імя М. Я. Фінберга — правялі маштабную падрыхтоўчую работу да фестывалю. Новаўвядзеннем сёлетняга культурнага форуму з'яўляецца пачатак яго мерапрыемстваў з 11 чэрвеня. Праходзяць прэзентацыі і сустрэчы з паэтамі ў працоўных калектывах раёна, канцэртныя праграмы. У перыяд з 11 да 13 чэрвеня на асноўных пляцоўках — гэта і цэнтральная плошча Маладзечна, і Цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча, Палац культуры, Музычны каледж імя Агінскага, пляцоўка каля кінатэатра «Радзіма» — арганізаваны канцэртныя праграмы творчых калектываў Мінскай вобласці, спектаклі, прэзентацыі кніг, пленэры і майстар-класы. Шэраг цікавых мерапрыемстваў рыхтуе таксама Саюз пісьменнікаў Беларусі. Як расказала **першы намеснік старшыні арганізацыі Алена СТЭЛЬМАХ**, на фестывалі сёлета можна будзе знайсці святочны настрой і ў кампаніі беларускіх паэтаў:

— У складзе нашай дэлегацыі будуць мэтры, класікі сучаснай беларускай паэзіі — Міхась Пазнякоў, Навум Гальпяровіч, Уладзімір Мазго. Сёлета мы робім асаблівы акцэнт на творчую моладзь. Нам вельмі хочацца, каб гучалі маладыя галасы, каб маладыя людзі бачылі запатрабаванасць жывога мастацкага слова.

Алена Стэльмах расказала, што ў першай частцы паэтычнага канцэрта «Пад сцягам Перамогі» можна будзе пачуць творы маладых аўтараў пра Вялікую Айчынную вайну, а ў другой частцы выступяць пераможцы конкурсу імя Міколы Мятліцкага. Акрамя гэтага, варта завітаць на сустрэчу з беларускімі літаратарамі ў паэтычным аўтобусе...

Традыцыйна на сцэне Амфітэатра Маладзечна 14 чэрвеня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XXIII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Жыхары і госці горада ўбачаць гала-канцэрт «Мелодыі сэрца» ад рэжысёра Ніны Осіпавай. Ён пройдзе ў суправаджэнні аркестра імя Фінберга. Канцэпцыя канцэрта прадугледжвае так званае падарожжа па фестывалі праз выкананне найлепшых яго песень, якія сталі беларускімі шлягерамі. Неад'емнай часткай творчага форуму з'яўляецца і Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Творчае спаборніцтва не толькі папулярызуе творчасць сучасных беларускіх паэтаў, кампазітараў, але і дае магчымасць выявіць новыя імёны маладых талентаў у галіне эстраднага выканання. Заключны рэспубліканскі этап конкурсу (II і III туры) пройдзе 15 чэрвеня ў Палацы культуры Маладзечна. Удзел возьме 21 канкурсант з усіх абласцей і горада Мінска. Напярэдадні 14 чэрвеня ў 17.00 у Палацы культуры адбудзецца знаёмства з канкурсантамі ў інтэрактыўнай форме, а таксама яны выцягнуць свае парадкавыя нумары для выступленняў. Пераможца традыцыйна стане ўладальнікам Гран-пры і спецыяльнага прыза Уладзіміра Мулявіна «Хрустальная гітара». Узнагароджанне лаўрэатаў адбудзецца напярэдадні гала-канцэрта закрыцця 15 чэрвеня на сцэне амфітэатра.

Канцэрт закрыцця фестывалю «Разам пра каханне», які рыхтуе Міёра Гвоздзева, у сваёй канцэпцыі прадугледжвае дуэтнае выкананне знаёмых і любімых песень беларускімі артыстамі і творчай моладдзю. Акрамя асноўных мерапрыемстваў, фестывальная праграма прапануе гледачам і ўдзельнікам свята вялікую колькасць мерапрыемстваў на сцэнічных і канцэртных пляцоўках горада і раёна.

Так, у дзіцячым парку сваіх наведвальнікаў будуць чакаць літаратурна-музычныя праграмы, куды завітаць можна ўсёй сям'ёй. Другі год гасцей фестывалю будзе чакаць кіно пад адкрытым небам. Сёлета прыхільнікі беларускага кіно змогуць паглядзець кінастужку «Ліст чакання» Аляксандра Яфрэмава. Вечарам пасля канцэрта закрыцця для моладзі будзе арганізавана дыскатэка ў суправаджэнні кавер-бэнда «Cosa nostra».

— Кожны год Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі мае свае асаблівасці. І сёлета мы не маглі ў яго мерапрыемствах і іх змесце абысці дзве галоўныя тэмы — Год якасці і 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — зазначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Ала ШАХОЦЬКА.** — Таму наша задача як арганізатараў заключалася ў тым, каб гледачы розных узростаў знайшлі сабе лакацыі па душы. Для гэтага рыхтуюцца літаратурныя і музычныя мерапрыемствы, прадугледжаны як выступленні прафесійных артыстаў, так і аматарскіх калектываў і нашых маладых выканаўцаў.

**Алена ДРАПКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Глабальныя выдаткі на «чыстую» энергетыку ўзрастуць да $2 трлн



Глабальныя выдаткі на тэхналогіі ды інфраструктуру «чыстай» энергетыкі павінны сёлета дасягнуць 2 трыльёнаў долараў, нягледзячы на тое, што больш высокія выдаткі на фінансаванне перашкаджаюць новым праектам, асабліва ў краінах з эканомікай, якая фарміруецца і развіваецца, прагназуе Міжнароднае энергетычнае агенцтва (МЭА). Гэтыя сродкі будуць накіраваны на развіццё ў такіх сферах, як аднаўляльныя крыніцы энергіі, электрамабілі, атамная энергетыка, паліва з нізкім узроўнем выкідаў, сістэмы размеркавання і назапашвання электраэнергіі, адзначаецца ў справаздачы МЭА. Чакаецца, што ўкладанні ў «чыстую» энергетыку і энергасеткі ўпершыню перавысяць суму, якая будзе выдаткавана на выкапнёвыя віды паліва.

### Больш за тысячу японскіх кампаній заявілі аб банкруцтве



Колькасць збанкрутавалых кампаній у Японіі ў маі ўзрасла да самага высокага ўзроўню з 2012 года, паведаміў тэлеканал NHK. Паводле звестак даследчай фірмы Teikoku Databank, у мінулым месяцы 1016 японскіх кампаній заявілі аб банкруцтве. Гэта на 46 працэнтаў больш, чым у маі мінулага года. Пры гэтым колькасць банкруцтваў у транспартнай галіне павялічылася больш як удвая, а колькасць збанкрутавалых рэстаранаў і бараў узрасла на чвэрць. Адзначаецца, што банкруцтвы адбываюцца на фоне таго, што звязаная з пандэміяй каранавіруса дзяржаўная падтрымка прадпрыемстваў, якія адчуваюць цяжкасці, падыходзіць да канца. Акрамя таго, многія кампаніі сутыкаюцца з недахопам працоўнай сілы. Ціск таксама аказвае рост цэн, паколькі дэвальвацыя ены прывяла да росту кошту сыравіны і энергіі.

### Сітуацыя з харчаваннем можа пагоршыцца яшчэ ў 17 краінах



Аб гэтым заявіў дырэктар аддзялення Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (Food and Agriculture Organization, FAO) па сувязях з РФ Алег Кабякоў, паведаміла РІА «Новости». «Ёсць дакумент па колькасці галадаючых, які выдаецца сумесна з Сусветнай харчовай праграмай, аб так званых гарачых пунктах голаду», — паведаміў Алег Кабякоў. Ён адзначыў, што сярод іх традыцыйна — Емен, Судан, Паўднёвы Судан, сектар Газа і шэраг іншых афрыканскіх краін, якія закрануты ўзброенымі канфліктамі, негатыўнымі наступствамі змены клімату, стыхійнымі бедствамі. Як вядома, Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН з'яўляецца міжурадавай міжнароднай арганізацыяй, якая займаецца пытаннямі харчовых рэсурсаў і развіцця сельскай гаспадаркі розных краін. FAO адыгрывае вядучую ролю ў міжнароднай дзейнасці, накіраванай на барацьбу з голадам.

Сямейная газета
Выпуск № 10 (235)

# Самы галоўны дзённік



Многае ў нашым жыцці адбываецца не проста так. Патрэбныя пытанні і адказы на іх Сусвет падказвае своечасова. Вось днямі вярталіся з сям'ёй з вандроўкі, і сын спытаў у мяне: «Мама, каго ты любіш больш — мяне, сябе ці тату?» — «Вядома, сябе», — адказала я і абняла Сымона, які, відавочна, чакаў пачуць іншы адказ... Бо «ўменне любіць іншых людзей і клапаціцца пра іх знаходзіцца ў прамой залежнасці ад умення любіць сябе і клапаціцца пра сябе». Гэты адказ на сынава пытанне я атрымала нейкім чароўным чынам літаральна праз некалькі дзён — праз паштоўку, якую падарыла мне пасля сеансу масажу былая аднагрупніца.

*Самая галоўная задача жанчыны, перакanana знаёмая псіхолаг і шматдзетная маці Марына Мысклівец, — нястомна клапаціцца аб сваім шчасці, штодня рабіць сябе напоўненай і радаснай. Не варта чакаць гэтага ад мужчын, ад дзяцей, ад сяброў і знаёмых. Гэта выключна наша жаночая адказнасць. Кожны дзень трэба прыдумваць штосьці новае для свайго шчасця, рабіць для сябе маленькія і вялікія радасці, укладваць у сябе грошы і час! Так, быць шчаслівай — гэта праца, і часам яна бывае вельмі нялёгкай. Здараецца, мы паглыбляемся ў сум, і нам хочацца, каб хтосьці прыйшоў і зрабіў нас шчаслівымі. Але менавіта гэта думка вельмі часта становіцца праблемай. Тут якраз да месца згадалася прытча «Урок матылька». Пра тое, як чалавек заўважыў, што ў кокане з'явілася маленькая шчыліна. Ён, як зачараваны, стаяў і назіраў, як скрозь яе спрабуе вылезці матылёк. У нейкі момант мужчына вырашыў зрабіць «добрую справу» і дапамагчы малечы. Узяў ножык і разрэзаў кокан. І матылёк імгненна вылез са свайго часовага доміка. Але яго цельца было настолькі слабым, што празрыстыя крылцы амаль зусім не рухаліся. У выніку ўсё сваё астатняе жыццё бедны матылёк правёў на зямлі. Паляцець ён так і не змог... Сама прырода прымушае вусеня з цяжкасцю пакідаць кокан, каб потым ператварыцца ў матылька і, загартаваўшыся, свабодна лётаць. Так і нам, людзям, цяжкасці часам проста неабходныя. Пераадольваючы іх, мы становімся шчаслівымі. І ў нас вырастаюць крылы.*

*«Менавіта тыя жанчыны, якія ўмеюць быць шчаслівымі без чыёйсьці дапамогі, могуць пабудаваць шчаслівыя адносіны, дасягнуць вялікіх вышынь у любых пачынаннях, вырасціць здаровых дзяцей, бо іх шчасце забяспечвае энергіяй усю сям'ю. Шчаслівая жанчына — крыніца шчасця многіх людзей», — лічыць псіхолаг Юлія Судакова.*

*Але каб навучыцца быць шчаслівай, спачатку трэба палюбіць сябе. Марына Таргакава ў кнізе «Шлях жанчыны» ўмоўна падзяляе любоў да сябе на тры часткі. «Калі я сябе ў большай ступені асацыірую з целам, то «палюбіць сябе» — гэта схадзіць на масаж, касметыку сабе купіць, ну, укладку зрабіць. Гэта адзін варыянт і гэта нармальна. Калі я лічу, што «я» — гэта мой розум, настрой, пачуцці, перажыванні, то «палюбіць сябе» — знаходзіць нейкія вельмі цікавыя ідэі, гармонію... А палюбіць сябе як душу — гэта значыць заняць сябе служэннем Богу, прысвячаць час малітве, Свяшчэнным Пісанням, зносінам з духоўнымі людзьмі... Калі нейкая адна частка правісае, жанчына, як правіла, будзе адчуваць унутры незадаволенасць. Таму, каб цалкам раскрыць свой жаночы патэнцыял, трэба навучыцца любіць сябе на ўсіх узроўнях, усю-ўсю-ўсю сваю сутнасць, і ў цэнтры гэтай сутнасці — душа».*

*А яшчэ для поўнага шчасця, мне здаецца, вельмі важна культываваць у сабе пачуццё ўдзячнасці. Днямі сяброўка падвезла мяне на машыне ў цэнтр горада. І ўсю дарогу яна ўслых наракала на іншых кіроўцаў, якія позна паказалі паварот, не так прыпаркаваліся... І я злавіла сябе на думцы, што, абураючыся, больш шчаслівай Верачка не становіцца...*

*У кнізе Алены Трыандафілавай, выкладчыцы псіхалогіі, жонкі праваслаўнага святара, «Тайна благодарения» ёсць адна гісторыя пра жанчыну, якая зайздросціла сваёй сяброўцы. Маўляў, у яе багаты муж, дыхтоўны дом, рэгулярныя паездкі на мора. Яна злавалася на свайго сужэнца, які не стаў бізнесменам, на сваё, як ёй падавалася, нецікавае жыццё. Калі ж, нарэшце, усвядоміла, што зайздрасць разбурае яе — пачала дзякаваць Богу за тое, ШТО ён даў ёй. Паступова прыйшло новае разуменне: яна згадала грахі свайго юнацтва і пачала дзякаваць Богу за ўсе яго міласці, у тым ліку і да сябе.*

*...Некалькі гадоў таму я па прыкладзе сяброўкі пачала кожны вечар, кладучыся спаць, пракручваць у памяці дзень: па крупінках збірала радасныя моманты, якія ў ім здараліся, і ў думках дзякавала за іх Богу. А нядаўна па парадзе любімай блогеркі Вольгі завяла дзённік удзячнасці: запісваю туды вялікія і маленькія цуды кожнага дня, каб зафіксаваць іх больш трывала і мець магчымасць у складаныя моманты перачытаць. І, ведаеце, кожны раз, калі перачытваю, шчыра і з удзячнасцю здзіўляюся: «Божа, якая я ўсё ж шчаслівая!»*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Тыя, хто побач

Ірына ВАРФАЛАМЕЕВА:

# «ЗА ЎСЁ ЎДЗЯЧНА МАМЕ!»

**«У аснове поспеху ляжаць правалы і памылкі, — гаворыць наша гераіня. — Без гэтага не будзе выніку». Мала хто ведае, які складаны шлях трэба пераадолець, каб выступаць на галоўнай сцэне краіны. І наколькі для творцы важная падтрымка сям'і. Для Ірыны такая падтрымка — матуля, якая расціла дачку адна. Пра месца сілы, погляд на сямейныя традыцыі і шлях да прафесіі — у нашай размове з лаўрэатам міжнародных конкурсаў, балерынай Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Ірынай Варфаламеевай.**



## «УСЁ, ЧАГО ДАСЯГНУЛА, — МАТУЛІНА ЗАСЛУГА»

— Мая маці — цудоўны чалавек. Родам з Крычава. Бацька загінуў, калі я была зусім маленькай. Яго радзіма — Алтайскі край, — пачынае размову Ірына. — У матулі, Таццяны Аляксееўны, тры вышэйшыя адукацыі. Па першай яна інжынер, па другой — эканаміст, і трэцяя адукацыя — выкладчык. Працуе ў Беларускім дзяржаўным аграрна-тэхнічным універсітэце на кафедры трактароў і аўтамабіляў. У нашай сям'і ніхто не быў звязаны з творчасцю. Усе інжынеры, матэматыкі, будаўнікі. Толькі мяне неяк занесла ў творчую прафесію (*смяецца*).

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

На думку парламентарыя

Ірына ДАЎГАЛА:

# «Сям'я для беларусаў застаецца найвышэйшай каштоўнасцю»

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Ірына Даўгала — пра сваю грамадскую дзейнасць, нацыянальную ідэю і сустрэчы з моладдзю.**

***— Ірына Віктараўна, перш за ўсё, віншую вас з выбраннем старшынёй пярвічнай арганізацыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Палаты прадстаўнікоў, якое адбылося непасрэдна перад нашай з вамі сустрэчай.***

— Дзякуй. Сапраўды, перажываю эмацыянальны ўсплёск, паколькі падзея, пра якую вы кажаце, мае каласальную ступень адказнасці. Я ўдзячная сваім калегам і Старшыні Палаты прадстаўнікоў, які прапанаваў маю кандыдатуру, за аказаны давер. А цяпер пачынаецца самае складанае — гэты давер апраўдаць. Больш за тое — уносіць крэатыўная ідэі. Але ідэі без увасаблення — нішто. Таму — ідэі, увасабленне і вынік. І, напэўна, задавальненне. Тады праца прынясе асалоду.



***— А з чаго пачняце?***

— Улічваючы, што была старшынёй пярвічнай арганізацыі Палаты прадстаўнікоў у мінулым скліканні, мяркую выкарыстоўваць найлепшае з напрацаванага вопыту.

Дзейнасць «Белай Русі» накіравана на захаванне канстытуцыйнага ладу, падтрымку дзеючай улады, патрыятычнае выхаванне і прасоўванне дзяржаўных ідэй.

Кожны год у нашай краіне прысвечаны пэўнай тэматыцы. Сёмае скліканне Палаты прадстаўнікоў пачынала сваю работу ў перыяд трылогіі малой радзімы. Мы тады арганізавалі фотавыстаўку «Любае месца малой радзімы парламентарыя». Кожны дэпутат, незалежна ад таго, з'яўляецца ён членам «Белай Русі» або не, выставіў сваю фотаработу. Дзіўна, наколькі яны былі розныя!

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# «Сям'я для беларусаў застаецца найвышэйшай каштоўнасцю»



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Якое фота было ваша?***

— Дом маіх бабулі і дзядулі. Там ужо нікога няма. Гэта ў Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці, там жылі бацькі майго таты. Бабуля з дзядулем разам пражылі 66 гадоў і перадалі нам у спадчыну самую галоўную каштоўнасць — вернасць таму, з кім звязана тваё жыццё. Мы з мужам



адзначылі 35-годдзе сумеснага жыцця, мой сын жыве ў шлюбе восем гадоў... Я шаную і ганаруся такой спадчынай.

Тая фотавыстава атрымалася вельмі душэўнай. Сапраўдны клубнічны і агурковы рай паказала брэсцкая дэпутацыя. Я ўбачыла ягады проста неверагодных памераў. Шматдзетны дэпутат з Віцебшчыны прадставіў фатаграфію сваёй сям'і падчас велапрабегу «За Беларусь!», ён патлумачыў: месца, дзе яны ўсе разам, і ёсць для яго любае. Цікава было глядзець на фотапартрэты старых бацькоў.

І зноў я лавіла сябе на думцы: наколькі моцныя ў нас карані, а значыць, наколькі жыццядзейнае наша нацыянальная дрэва. Сям'я для беларусаў застаецца найвышэйшай каштоўнасцю. Важна, каб так было і для будучых пакаленняў.

Я сваю ўнучку важу па памятных мясцінах краіны — мы былі з ёй у Хатыні, на Партызанскай крынічцы пад Гомелем, збіраемся на Алу... Яшчэ расказваю ёй пра яе прадзедаў. Мой дзед па лініі маці, Павел Васільевіч Хацько, ваяваў у партызанскім атрадзе ў Лепельскім раёне Віцебскай вобласці. У Лепельскім краязнаўчым музеі ёсць яго фатаграфія, а ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў электронным банку партызанскага руху мы з сястрой знайшлі яго ўзнагародныя лісты. Пра некаторыя яго ўзнагароды мы нават не ведалі.

***— На што натхняе Год якасці?***

— Гэта стане прадметам абмеркавання Савета, які быў выбраны. У мяне ёсць пэўныя думкі. Круціцца ў галаве назва праекта: «Усё найлепшае — беларускае!». Год якасці — гэта не толькі пра якасную прадукцыю, якую выпускаюць нашы прадпрыемствы. Гэта і пра якасць нашых адносін да працы, і пра якасць нашага жыцця... Не трэба блытаць з узроўнем жыцця. Заробку ніколі і нікому не будзе дастаткова. Памятаеце дыялог Антылопы і Раджы з савецкага мультфільма «Залатая антылопа»? «Колькі табе трэба золата?» — «Э-э-э... шмат!!» — «А калі яго будзе занадта шмат?» — «Неразумная жывёла! Золата не можа быць занадта шмат!»

Я прытрымліваюся прынцыпу: шчаслівы не той, у каго ўсяго шмат, а той, каму ўсяго хапае. Чалавек так уладкаваны, што ён заўсёды хоча больш. А як важна ўмець радавацца таму, што маеш. Нават калі гэта проста сонца ў небе.

**Бабуля з дзядулем разам пражылі 66 гадоў і перадалі нам у спадчыну самую галоўную каштоўнасць — вернасць таму, з кім звязана тваё жыццё.**

А пачнём, напэўна, з мітынгу-рэквіема 22 чэрвеня. Тры гады таму перад уваходам у Авальную залу былі размешчаны мемарыяльныя дошкі з імёнамі 94 дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, якія загінулі і прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны. Першыя беларускія парламентарыі з гонарам выканалі свой абавязак перад Радзімай. Нам застаецца захаваць пра іх памяць для маладога пакалення.

***— На пачатку размовы вы згадалі пра каштоўнасць сям'і. Гэтай тэме быў прысвечаны і адзін з апошніх пастоў у вашым тэлеграм-канале. Вы выказалі думку: ці не зрабіць культ сям'і нацыянальнай ідэяй Беларусі?***

— Я заўсёды пра гэта думаю. Прыйшла працаваць у органы дзяржаўнай улады ў 1992 годзе, адразу пасля развалу Саюза. У розных іпастасях брала ўдзел ва ўсіх выбарчых кампаніях суверэннай Беларусі. І ўвесь мой асабісты, такі немалы, вопыт пацвярджае выказванне: моцная сям'я — моцная дзяржава.

Сям'я закладвае ў чалавеку мараль, здольнасць спраўляцца з выпрабаваннямі, патэнцыял для развіцця, яна навучае любові, самаахвярнасці, культуры. Але самае галоўнае ў сям'і — нараджэнне дзяцей. Нездарма дэмаграфічны складнік закладзены ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі. Шматдзетныя сем'і павінны стаць нормай. Без прыросту насельніцтва немагчымы росквіт нацыі.

Пра тое, што жыць у краіне добра, сведчаць дзве прыкметы — будаўніцтва новых дамоў і цяжарныя жанчыны на вуліцы. У Беларусі шмат робіцца для падтрымкі сям'і. Мала дзе ёсць такі працяглы водпуск па доглядзе дзіцяці, як у нас. Грашовая дапамога, льготныя жыллёвыя крэдыты, ахова здароўя і адукацыя... Дзяржава стварыла і давяла да ладу механізм па сацыяльнай абароне сваіх грамадзян, які сёння мадэрнізуецца і ўдасканальваецца па ўсіх кірунках.

На мінулым тыдні Прэзідэнт нашай краіны наведаў Манголію і расійскі Іркуцк. Падчас гэтых візітаў ён, як заўсёды, вырашаў вельмі разнапланавыя пытанні, але ўсе яны накіраваны на дабрабыт беларусаў. Разам з тым важна памятаць, што сям'я — гэта не толькі пра матэрыяльнае. Сям'я — гэта месца, дзе чалавека заўсёды чакаюць, дзе ён надзвычай патрэбны, дзе яго цэняць і прымаюць любым: стомленым, пакрыўджаным, вясёлым... Такім, які ён ёсць. Гэта першы соцыум, у якім аказваецца дзіця, калі з'яўляецца на свет.

Упэўнена, што самая вялікая пагроза для бяспекі дзяржавы — гэта вымыванне сямейных каштоўнасцяў. Гэта адбываецца спакваля. Цяпер не трэба ствараць для гэтага нейкія арганізацыі. Дастаткова сучасных тэхналогій. Чалавек сёння прачынаецца і першай справай мацае каля падушкі смартфон, з якім некалькі гадзін таму засынаў. Дзякуючы сацыяльным сеткам пра кожнага з нас усё вядома: дзе гуляем, што ядзім, з кім сустракаемся, што купляем, чым цікавімся...

Я ўвогуле лічу, што калі чалавек выкладае сваё асабістае жыццё, да дробязяў, на ўсеагульны агляд, гэта сведчыць пра пэўную дэградацыю асобы. На гэты конт у мяне неяк атрымалася спрэчка з дзяўчынай у маладзёжнай аўдыторыі. Яна кажа: «Мая старонка ў сацыяльнай сетцы — што хачу, тое і пішу там». Чакайце, але калі ваша старонка даступная ўсім, то гэта ўжо публічнае выказванне. І ці варта выстаўляць на ўсеагульны агляд тое, што павінна заставацца ўнутры міжасабовых адносін, сям'і, дома? Усе свае перажыванні? Мы аддаём сваё жыццё не проста на публіку, але і на публічны кантроль, абмеркаванне і асуджэнне. У выніку ў нас для саміх сябе нічога не застаецца.

**Сям'я — гэта месца, дзе чалавека заўсёды чакаюць, дзе ён надзвычай патрэбны, дзе яго цэняць і прымаюць любым: стомленым, пакрыўджаным, вясёлым...**



**«Дыялог з моладдзю... Што можа быць лепш...?!»**
**Фота і цытата з тэлеграм-канала**
**«Ирина Довгало. За достойную жизнь!»**

**Упэўнена, што самая вялікая пагроза для бяспекі дзяржавы — гэта вымыванне сямейных каштоўнасцяў.**

Паглядзіце, мы перасталі ствараць сямейныя фотаальбомы (затое ўсё, што з намі адбываецца, як на далоні, у стужцы «Інстаграм»), усё радзей збіраемся за агульным сталом... Узрост людзей, якія ствараюць сям'ю, павышаецца. Сучасная моладзь лічыць, што спачатку трэба дасягнуць пэўных вынікаў у кар'еры, фінансавай незалежнасці, пабачыць свет, набыць асобнае жыллё... А жыццё ідзе. І для нараджэння дзяцей у ім застаецца ўсё менш месца і часу.

**Чалавек так уладкаваны, што ён заўсёды хоча больш. А як важна ўмець радавацца таму, што маеш. Нават калі гэта проста сонца ў небе.**

***— На сустрэчах з моладдзю вы абмяркоўваеце не толькі сямейныя каштоўнасці, небяспеку залежнасці ад сучасных гаджэтаў, але і галоўныя палітычныя працэсы — як глабальныя, так і ўнутраныя. Што кажаце, калі размова заходзіць пра Усебеларускі народны сход?***

— З моладдзю вельмі важна размаўляць жывой мовай. Кажу пра тое, з чаго ўсё пачалося. У 1996 годзе Прэзідэнт прапанаваў спытаць меркаванне народа падчас сур'ёзнага крызісу. Ад пераадолення гэтага крызісу залежала будучыня краіны. Пытанне стаяла пра ўласнасць на зямлю, пра прыватызацыю ключавых прадпрыемстваў нашай эканомікі. УНС вынес гэтыя пытанні на рэферэндум і тым самым выканаў важную ролю стабілізатара грамадства, вызначыў выбар шляху яго развіцця. Менавіта УНС садзейнічала захаванню АПК Беларусі, што пазней дазволіла нам вытрымаць санкцыйны ціск, гарантаваць харчовую бяспеку краіны. Гэта датычыцца і атамнай энергетыкі. Мы сёння бачым, наколькі мудрым, узважаным для перспектывы было рашэнне Прэзідэнта аб скліканні Усебеларускага народнага сходу і вызначэнні яго ролі. Сход вызначыў фарватар і адначасова выступаў лакаматывам руху грамадства. Сёння гэта найвышэйшы орган народаўладдзя. УНС дэманструе сімбіёз і ўзаемадапаўняльнасць дзяржаўных органаў улады і народа. Пра ўсё гэта кажу моладзі, прапаноўваю змадэляваць сітуацыю, калі б у нас не развівалася сельская гаспадарка... Кажу пра тое, што малако на дрэвах не расце. Што цуды людзі ствараюць самі. Што нам сёння ўжо не важна, які па ліку пакет санкцый супраць Беларусі прымаецца.

А завяршаю гутарку традыцыйна пажаданнем любові — да сям'і, да сваёй справы і да Беларусі. Бо лепш за Беларусь — толькі Беларусь.

***— Дзякуй!***

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ІНКЛЮЗІЯ ДЛЯ «СКАЛІЁЗНІКА»

**ПРА тое, што ў дачкі праблемы з постаццю, бацькі даведаліся, калі ёй было ўсяго 10 гадоў. Але вырашылі, што неяк абыдзецца. Ды і ў спецыялізаваную школу не хацелі аддаваць. Дзяўчынка здольная, гімназістка, год страціць — і кар'ера потым можа не адбыцца... У наступны раз, калі доктар паказаў дзяўчынцы здымкі яе скрыўленага пазваночніка, яна з жахам выбегла з кабінета. Трэба было яшчэ тады памяняць свой лад жыцця, прыслухацца да рэкамендацый спецыяліста. Але чамусьці цягнулі час. І толькі калі ў 28 гадоў прыгажуня ператварылася ў гарбунню, сям'я гатова была аддаць любыя грошы за аперацыю. Урачы ў адказ толькі рукамі разводзілі: дэфармацыя закранула ўжо не толькі пазваночнік, але і ўнутраныя органы... Гісторыя, дарэчы, цалкам з жыцця. Рэнтгенаўскія здымкі пазваночніка гэтай дзяўчыны знаходзяцца ў медкабінеце Магілёўскай санаторнай школы-інтэрната для дзяцей, хворых на скаліёз.**

## Дзявочая хвароба

Скаліёз — хвароба каварная і бязлітасная. Здольная за кароткі час ператварыць знешне здаровага чалавека ў інваліда. Сучасныя ўмовы жыцця — маларухомасць, завісанне ў інтэрнэце, а яшчэ акселерацыя, калі мышцы не паспяваюць за пазваночнікам і ён пачынае дэфармавацца — вельмі садзейнічаюць разбурэнню арганізма. Санаторныя школы для хворых на скаліёз — а іх у краіне ўсяго пяць — даюць магчымасць запаволіць гэты працэс, дапамагчы дасягнуць рэмісіі.

— Часцей за ўсё на скаліёз пакутуюць дзяўчынкі, — расказвае **дырэктар Магілёўскай санаторнай школы-інтэрната для дзяцей, хворых на скаліёз, Яўген РУДАКОЎСКІ.** — Па статыстыцы, на пяць прадстаўніц жаночага полу прыходзіцца толькі адзін прадстаўнік мужчынскага. Для дзяўчыны скаліёз — гэта, лічы, катастрофа. Вельмі вялікая рызыка пазбавіцца радасці мацярынства. Хвароба можа праявіцца, калі яна была ў кагосьці з бацькоў або калі сын або дачка пакутуюць на плоскаступнёвасць. Бывае, што скаліёз правакуе вялікі спорт. За 15 гадоў сваёй работы тут я ўсякіх дзяцей пабачыў.

У Магілёўскай санаторнай школе-інтэрнаце могуць праходзіць навучанне максімум 135 чалавек. Сёлета было 114 выпускнікоў. Але спецыялісты кажуць, што ў сённяшніх дзяцей скаліёз ледзь ці не ў кожнага другога. Некаторыя пра гэта нават і не здагадваюцца, бо на першапачатковым этапе хваробу не відаць. Ёсць і іншая катэгорыя пацыентаў. Гэта дзеці, якіх бацькі шкадуюць, не лічаць патрэбным аддаваць у спецыялізаваную школу. Для гэтага трэба цалкам змяніць свой лад жыцця, прыстасавацца да дастаткова жорсткага рэжыму, а гэта вельмі балюча. Пакуль адны не ведаюць, а другія вагаюцца, хвароба прагрэсіруе.



Перасцерагальныя здымкі з медкабінета: скаліёз здольны за кароткі час разбурыць чалавека.

## У спартанскіх умовах

У пачатку нулявых Магілёўская школа-інтэрнат для дзяцей, хворых на скаліёз, была на мяжы закрыцця. Ёй пашчасціла, з дапамогай Магілёўскага аблвыканкама ў будынках установы быў зроблены рамонт. Тут таксама з падзякай успамінаюць дабрачынную арганізацыю з Паўночнай Германіі, дзякуючы якой у школе абнавілася мэбля, а ў 2010 годзе нават з'явіўся аўтобус, якім тут карыстаюцца па сённе. Цяпер асноўныя спонсары ўстановы — Магілёўскія аблгаз і друкарня імя С. Собаля. З іх дапамогай істотна абнавілі мэблю і часткова — кушэткі ў вучэбных класах. Сёлета галоўнае ўпраўленне па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама прыступіла да распрацоўкі ПКД на замену дахаў двух карпусоў.

Школа працуе па той жа агульнаадукацыйнай праграме, што і іншыя, і экзамены яе вучні здаюць, як і ўсе. Штогод яны атрымліваюць дыпломы на алімпіядах. Вось толькі ўмовы іншыя. Першага верасня сюды прыязджаюць дзеці, у тым ліку і з Віцебшчыны, дзе такой школы няма, і для іх пачынаецца зусім іншае жыццё. На ложках — шчыты, цвёрдыя матрацы, няма падушак. У класах часткова — парты, часткова — кушэткі, на якіх 40 хвілін трэба ляжаць тварам уніз і паспяваць запісваць за настаўнікам. З непрывычкі гэта вельмі цяжка. Таму і ўрокі не па 45 хвілін, а па 40 з пяціхвіліннай фізразмінкай у сярэдзіне.

— Адаптацыя складаная, асабліва цяжка ў першыя два месяцы, — не хавае праўду пра спартанскія ўмовы жыцця дырэктар. — Але што рабіць? Скаліёз — гэта хвароба, і сюды дзяцей накіроўваюць па паказаннях УКК, які і вызначае ступень скаліёзу. Раней умовы былі яшчэ больш жорсткія. У канцы 1970-х мінулага стагоддзя дзеці спалі ў «гіпсавых ложках», дзе нават павярнуцца нельга. Цяпер спяць у гарсэтах, што таксама не вельмі зручна. Але яны могуць хоць бы павярнуцца на бок. І жывуць у нас ужо не па пяць-шэсць гадоў, як гэта было раней, а ў асноўным год.


Дырэктар Яўген РУДАКОЎСКІ: «Новыя кушэткі больш зручныя ў параўнанні са старымі».

Пад канкрэтны дыягназ падбіраецца лячэбная фізкультура. Яшчэ не ўсякія практыкаванні можна выконваць. Напрыклад, падцягванне, скокі, скручванні нельга. Да яшчэ большай дэфармацыі могуць прывесці скокі на батуце або язда на скейце. Цяпер у школе-інтэрнаце практыкуецца стральба з лука. Яўген Рудакоўскі з гонарам кажа, што яны некалькі гадоў таму вывучылі расійскі вопыт па лячэнні скаліёзу з дапамогай стральбы з лука і напісалі праект «Яблычка». Пад яго былі выдзелены грошы, і школа змагла адкрыць залу адаптыўнай стральбы з лука. Стральба дапамагае пры лячэнні грудзінна-паяснічнага скаліёзу 2-3-й ступеняў. Дзеці займаюцца строга пад наглядам прафесійных трэнераў вось ужо два гады. Вельмі эфектыўнае пры скаліёзе плаванне. Але і тут трэба ведаць, якія практыкаванні выконваць і як пры гэтым дыхаць.

## Паміж гарсэтам і «ляжанкай»

Да кабінета ўрача-артапеда Валерыя Андаралы — чарга на кансультацыю.

На прыёме — юная пацыентка з маці. Жанчына расказвае, што пра хваробу даведаліся, калі пазваночнік дачкі скрывіўся на 20 градусаў. Выратавала своечасовае гарсэтнае лячэнне. Некаторы час дзяўчына вучылася ў санаторнай школе-інтэрнаце, потым вярнулася дамоў, але засталася пад наглядам урача. Цяпер у яе, як адзначае спецыяліст, карэкцыя добрая.

— За апошняе дзесяцігоддзе хвароба стала вельмі прагрэсіраваць у свеце, — перасцерагае Валерый Фёдаравіч. — Прыкметы пачатку скаліёзу могуць праявіцца ўжо ў 5-6 гадоў. Трэба звяртаць увагу на суадноснасць лапатак свайго сына або дачкі. Калі нешта не спадабалася, лепш падзяліцца сваімі падазрэннямі з артапедам.

У калідоры знаёмімся з Евай. Яна таксама былая выхаванка санаторнай школы-інтэрната. Вучылася тут чатыры гады таму. Прыехала з маці на прыём да ўрача, каб пераканацца, што ўсё добра, і выпісаць новы гарсэт з улікам росту. Ева носіць гэту рэч з 6 класа і будзе карыстацца ёю, пакуль пазваночнік не памацнее. Прыкладна да 19-20 гадоў.

Ева прызнаецца, што менш за ўсё ёй падабаліся «ляжанкі», як паміж сабой дзеці называлі вучэбныя кушэткі. Імі карыстаюцца вучні з невялікай ступенню скаліёзу. Ляжаць на жываце — ідэальная поза для пазваночніка, але шыя з непрывычкі першы час зацякае і ўсё цела баліць. Добра, што яшчэ пасярод урока бываюць 5-хвілінкі, падчас якіх можна размінацца. Падлеткі з большай ступенню скаліёзу павінны насіць, не здымаючы, гарсэт. Але ім дазваляецца сядзець за партай.

Маці дзяўчынкі Таццяна кажа, што санаторная школа для хворых дзяцей — гэта выратаванне. Тут іх літаральна ставяць на ногі і вяртаюць да нармальнага жыцця. Дарэчы, цалкам за кошт дзяржавы. Гарсэты таксама бясплатныя, выпісваюцца як неабходныя пацыенту лекі. І, што таксама вельмі каштоўна, пастаянны медыцынскі нагляд.



Выхаванцы школы-інтэрната ў музеі, прысвечаным ахвярам генацыду.

— Нашых выхаванцаў кантралюе Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі, — кажа дырэктар. — У прыватнасці, кандыдат медыцынскіх навук Дзмітрый Цесакоў. Перад выпіскай ён яшчэ раз аглядае кожнае дзіця і дае рэкамендацыі, як працягваць займацца здароўем дома.

## Ніхто не забыты...

На тэрыторыі школы-інтэрната — ажно два музеі. Адзін — гісторыі ўстановы, дзе захоўваюцца цікавыя школьныя экспанаты, сярод якіх настаўніцкі журнал 1962 года з двойкамі і пяцёркамі, сачыненні вучняў перыяду 1970-х на патрыятычную тэматыку, ліст удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі, які наведваў школу ў 1952 годзе, і шмат чаго іншага. Другі музей — зусім яшчэ малады, ён прысвечаны тэме генацыду беларускага народу. Натхніла на стварэнне музея педагог-арганізатар Вольга Рудакоўская, якая аб'яднала ўлюбёных у гісторыю дзяцей у групу «Вектар адзінства і сілы». Разам яны актыўна даследуюць гісторыю месца, дзе знаходзіцца школа-інтэрнат. Мясціны тут не толькі маляўнічыя, але і вядомыя сваімі трагічнымі падзеямі.

— Гестапа, турма, затым супрацьтанкавыя равы ў Палыкавічах, Пашкаве, Сараканайску — гэта самыя масавыя месцы знішчэння савецкіх грамадзян у гады акупацыі, — расказвае Вольга Рудакоўская. — Наконт месца ў лесе каля Сараканайска, які яшчэ называюць расстрэльны, я пісала лісты ад школы ў пракуратуру, каб там зрабілі мемарыяльны комплекс. У 1990-х гадах яго абазначылі каменем, але патрэбны менавіта мемарыяльны комплекс. Мы вывучалі архіўныя матэрыялы КДБ, дзе прыводзяцца агульныя падлікі ахвяр. Размова ідзе пра тысячы людзей. Даследчую работу вядзём сумесна са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігарам Марзалюком.

Шукаць факты ў архівах і афармляць іх на высокім мастацкім узроўні дапамагае супрацоўнік установы Дзяніс Казлоў. Ён таксама цалкам захоплены даследчай работай. Пад шклом у фае школы-інтэрната знаходзіцца вялікі альбом, дзе захоўваецца сабраная ў асноўным ім інфармацыя па 14 дзіцячых канцэнтрацыйных лагерах. (Да ведама, у інтэрнэце можна знайсці максімум па пяці.)

— Мы, дарослыя, паказваем прыклад дзецям, і яны адгукаюцца, — кажа Вольга Рудакоўская. — Вучні 9 класа Андрэй Пятроўскі і Ульяна Лішчына ўжо ведаюць, як працаваць у архівах, самі пішуць туды запыты. Калі ўцягваешся ва ўсё гэта, пачынаеш разумець, наколькі важна і неабходна ведаць мінулае. Як казаў наш Прэзідэнт, забудзем дарогу ў Хатынь — яна паўторыцца. Дзякуючы спонсарам з Федэрацыі прафсаюзаў (Міхаіл Орда асабіста прымаў удзел у лёсе ўстановы) нашы выхаванцы мелі магчымасць наведаць музей Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, пабываць на Кургане Славы, летась ездзілі ў Хатынь, сёлета — на Лінію Сталіна. Уражанняў шмат. Галоўнае, нашы дзеці разумеюць, што без мінулага няма будучыні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіва Магілёўскай санаторнай школы-інтэрната.**

Двое — гэта занадта?

# МІЛЫЯ СВАРАЦЦА...

## Чаму ў пары ўзнікаюць сваркі і як канфліктаваць правільна?



**СПАЧАТКУ мы захопленыя пачуццямі і глядзім на партнёра скрозь ружовыя акуляры — і ўсё ў ім цуд і радасць, і ва ўсім ён выдатны! Але час ідзе, і — асабліва калі мы пачынаем жыць разам — на змену нядаўняй ідыліі прыходзяць сваркі і канфлікты...**
**Дрэнная навіна ў тым, што сваркі ў любой пары непазбежныя — рана ці позна вы будзеце высвятляць адносіны. Але ёсць і добрая навіна: канфлікты ў адносінах — гэта нармальна, і калі сварыцца правільна, сямейная лодка не разаб'ецца аб побыт, а ператворыцца ў каравэлу, якой не страшны ніякі шторм.**

Такім чынам, непазбежна прыходзіць момант, калі з вачэй жонкі спадае заслона, і раптам аказваецца, што муж не такі ўжо ўважлівы, разумны і надзейны... А мама ж казала: «Не спяшайся, дачушка, прыглядзься больш уважліва...»

І ў мужа раптам з'яўляюцца пытанні да выбранніцы. А ці сапраўды яна мая палавінка? І ён таксама ўспамінае словы сваёй мамы: пачакай, маўляў, сынок, не спяшайся...

Карацей, закаханасць заканчваецца. У ідэале за гэты месяц павінна заняць каханне: два неідэальныя чалавекі бачаць недахопы адно аднаго, але разумеюць, што вартасці партнёра больш каштоўныя і важныя. У пары два варыянты развіцця падзей: або шляхам крызісаў і сварак паміж імі народзіцца, нарэшце, сапраўднае каханне, або, па інерцыі працягнуўшы яшчэ пару гадоў, яны прызнаюць, што «занадта розныя».

### А мама гаварыла...

Псіхолагі сцвярджаюць, што сямейныя сваркі не толькі непазбежныя, але яшчэ і... карысныя для адносін — у спрэчцы, як гэта ні банальна, сапраўды нараджаецца ісціна, а два блізкія чалавекі з іх дапамогай усведамляюць адрозненні ў вобразе мыслення, вучацца калі не прымаць, то хоць бы разумець пункт гледжання іншага. За канфліктам звычайна ідзе прымірэнне. І, калі мець на ўвазе людзей дарослых, разумных і ўсвядомленых, імкненне шукаць кампраміс — гэта магчымасць паказаць, як вы шануеце вашага партнёра і цэніце адносіны з ім. Такія прымірэнні ўмацоўваюць шлюб. Але ўсё гэта датычыцца сварак «правільных». Неканструктыўныя ж, «таксічныя» канфлікты — калі вы змагаецеся «не на жыццё, а на смерць», словам абражаеце партнёра, ставіце ўльтыматумы і пагражаеце разрывам, калі выкарыстоўваеце «тыказванні» і абагульняльныя фармулёўкі накшталт «ты вечна... ты заўсёды... ты ніколі...», калі ў выніку такіх сварак і пасля прымірэння вы пачынаеце непаважліва ставіцца да апанента, — руйнуюць саюз.

**Мужчыны заглядаюцца на маладзенькіх дзяўчат у надзеі даказаць сабе, што яны яшчэ «ого-го!», жанчыны ж кідаюць позіркі на сяброў дарослага сына.**

Першая, найбольш распаўсюджаная прычына сямейных сварак — не рэўнасць і не секс, а фінансы. Грашовае пытанне — самая частая прычына разладу паміж двума закаханымі. Асабліва калі яны жывуць разам і асабліва калі — як звычайна і бывае — адзін зарабляе больш за другога. Або калі адзін — марнатравец, а ў іншага ёсць схільнасць збіраць і адкладаць. Каб не трапіць у гэтую пастку, дастаткова абмеркаваць фінансавыя пытанні разумна і спакойна, і лепш — яшчэ да таго, як вы пачалі жыць разам, раяць сямейныя псіхолагі. Хоць, у прынцыпе, «сесці за стол фінансавых перагавораў» ніколі не позна. Ці весці агульны бюджэт, колькі ў яго будзе ўносіць кожны, колькі вы вырашыце выдзяляць на кожную катэгорыю сямейных выдаткаў... Дакладна пазначыўшы адказы на ўсе гэтыя пытанні, можна ў далейшым гасіць «грашовыя» канфлікты ў зародку. Нават калі вы з прычыны маладосці лічыце, што каханне і бухгалтэрыя несумяшчальныя, планаваць сямейны бюджэт усё ж лепш, чым адчуваць сябе вінаватай (таму што вы патрацілі больш, чым лічыў дапушчальным партнёр) або пакрыўджаным (таму што ваша «палавінка» не цэніць вашых намаганняў).

Другая самая частая прычына канфліктаў у пары — хатнія абавязкі. Асабліва калі вы абодва працуеце. У нашых рэаліях большая частка хатняй працы прыпадае на жаночыя плечы. І, дзень пры дні адпрацоўваючы «другую змену» дома, напэўна, любая жанчына пачне адчуваць раздражненне. Рашэнне — у разумным падзеле працы.



Падыдзіце да пытання дэталёва: хто мые посуд, хто — падлогу ці вокны, хто ходзіць па прадукты, хто загружае пральную машыну, а хто перасцілае пасцельную бялізну. І прычына сварак знікне сама сабой.

Наступная найбольш распаўсюджаная прычына сямейных канфліктаў сыходзіць каранямі ў бацькоўскую сям'ю. І гэта, дарэчы, адна з частых прычын нават разводаў і расставанняў. Справа ў тым, што першапачатковыя сямейныя сувязі — адна з самых глыбінных «настроек» нашай псіхікі. І калі вы недастаткова ўважлівыя да бацькоў партнёра ці яго (яе) бацькоўская сям'я вас не прымае або вы не прымаеце яго (яе) сям'ю, гэта стане тым «мазалём», на які вашы адносіны раз-пораз будуць наступаць. Больш за тое, якраз у бацькоўскай сям'і — вытокі законаў і правілаў, па якіх партнёр будзе выбудоўваць «палац» уже вашай сям'і. Менавіта адтуль ён запазычыў спосабы вырашэння канфліктаў у пары. Менавіта ўклад сям'і, у якой ён вырас, сфарміраваў яго «мову кахання» — тое, ці будзе ён стрыманым або адкрытым у праявах сваіх пачуццяў да вас. Так што паспрабуйце выбудаваць добрыя адносіны з мамай і бацькам, братамі і сёстрамі выбранніка/выбранніцы — хоць бы для таго, каб лепш зразумець сваю «палавінку».

Яшчэ адна неверагодна частая прычына сварак — адрозненні ў поглядах на выхаванне дзяцей. Калі, дапусцім, ён вырас у шматдзетнай сям'і, а яна была адзіным дзіцем, то, цалкам верагодна, яму будзе незразумелае і непрыемнае яе «заміранне над дзецьмі», а ёй будзе здавацца, што ён — абыякавы і няўважлівы бацька. Размеркаванне бацькоўскіх абавязкаў, спосабы заахвочвання і пакарання дзяцей — усё гэта таксама варта абмеркаваць як мага больш дэталёва і як мага раней (пакуль дзіця яшчэ маленькае), раяць псіхолагі. Таму што сваркі з гэтай нагоды закранаюць ужо не толькі дваіх — больш за ўсё пакутуе дзіця, якое, з аднаго боку, губляе выразныя арыенціры («што такое добра і што такое дрэнна», мама і тата тлумачаць па-рознаму), з другога — рана вучыцца быць маніпулятарам. У выхаванні дзяцей маці і тата павінны быць салідарныя, гэта адназначнае меркаванне псіхолагаў.

**Першая, найбольш распаўсюджаная прычына сямейных сварак — не рэўнасць і не секс, а фінансы.**

Ёсць і іншыя распаўсюджаныя прычыны сямейных канфліктаў. Напрыклад, асобасныя адрозненні мужа і жонкі (калі адзін — экстраверт, які любіць вясёлыя кампаніі, а другі — дамасед-інтраверт) або рэўнасць і праблемы з даверам. Ну, і для паўнаты карціны сюды можна дадаць сямейныя крызісы, аб непазбежнасці якіх псіхолагі паведамілі нам яшчэ ў мінулым стагоддзі.

### Крызісны каляндар

Прынята лічыць, што існуюць крызісы года, трох, сямі, пятнаццаці і дваццаці пяці гадоў адносін. У розных сем'ях тэрміны могуць змяняцца, і ўсё ж кожная пара-«доўгажыхар» праходзіць гэтыя этапы і выбоіны «вялікага шляху»:

**• крызіс «шэрых будняў»**

Рамантыка змяняецца штодзённасцю, і вы раптам разумееце, што захапляльны раман ператварыўся ў руціну, а на змену святу надышлі шэрыя будні. Галоўнае на гэтым этапе — не спрабаваць перарабляць адно аднаго, не імкнуцца палепшыць тое, што вам «дасталася». Лепш абмеркаваць найболей прынцыповыя пытанні, якія замінаюць камфортнаму сумеснаму існаванню, і навучыцца спакойна рэагаваць на «кропкі несупадзення». А самае галоўнае — знайсці і высока ацаніць тыя несумненныя плюсы, якія дораць вам адносіны менавіта з гэтым чалавекам.

**• крызіс бацькоўства**

У вашай сям'і з'яўляецца яшчэ адзін чалавек — і гэты крызіс атрымліваецца пераважна далёка не ва ўсіх сем'ях. Цяпер вы мама і тата, і вам трэба будзе ўжыцца ў гэтыя новыя ролі. Нараджэнне дзіцяці — выпрабаванне на «дарослась» для кожнага з бацькоў, а таксама праверка на «дарослась» іх адносін паміж сабой. Каб з гонарам вытрымаць яе, падзяліце «фронт работ» і сферы адказнасці і не забудзьцеся аб асабістай прасторы і для мамы, і для таты.

**• «няма таго, што раней было...»**

Быт наладжаны, дзеці падраслі, кар'ерныя пытанні таксама больш-менш вырашаны. Быццам бы ўсё добра — і на гэтым фоне вы пачынаеце адчуваць недахоп... адрэналіну. Недахоп адчування «жывога жыцця», яркіх пачуццяў і эмоцый. Менавіта гэты крызіс небяспечны здрадамі. Псіхолагі раяць з усімі падобнымі адчуваннямі, эмоцыямі і «хацелкамі» ісці не «налева», а да сваёй «палавінкі» — хто зразумее вас лепш, чым чалавек, які стаў за гады самым блізкім і родным?

**• сівізна ў бараду**

Як правіла, гэты сямейны крызіс супадае з індывідуальным крызісам сярэдняга ўзросту. Мужчыны заглядаюцца на маладзенькіх дзяўчат у надзеі даказаць сабе, што яны яшчэ «ого-го!», жанчыны ж кідаюць позіркі на сяброў дарослага сына. Пераж́ыць такі перыяд трэба спакойна і з разуменнем. Накіруйце энергію ў мірнае рэчышча: займіцеся спортам, змяніце імідж, прыдумайце сабе хобі. І не забывайце казаць сваёй «палавінцы», як выдатна ён/яна выглядае і як ёй/яму «ніхто ніколі не дасць твой узрост».

**Псіхолагі сцвярджаюць, што сямейныя сваркі не толькі непазбежныя, але яшчэ і... карысныя для адносін — у спрэчцы, як гэта ні банальна, сапраўды нараджаецца ісціна.**

**• восень жыцця**

Дзеці стварылі свае сем'і і перыядычна падкідваюць вам унукаў на канікулы. Пенсія ўсё бліжэй — а можа, вы ўжо на пенсіі. Але яшчэ поўныя сіл і нерастрачанай энергіі. Што з ёю рабіць, куды рухацца далей? Вы адчуваеце разгубленасць і, як вынік, сум і раздражненне. Не варта перажываць! Бо цяпер — выдатны час успомніць, за што вы калісьці пакахалі свайго выбранніка. Не як «каменную сцяну», здабытчыка ці будучага бацьку вашых дзяцей, а як чалавека і асобу. Што вас яднала? Можа, надышоў час вярнуцца да агульных захапленняў і прысвяціць жыццё адно аднаму?

### Сварыцца трэба ўмець

Калі сварыцца ў шлюбе — нармальна, то калі варта пачынаць хвалявацца? У якім выпадку псіхолагі канстатуюць, што канфлікты ў пары перайшлі ў нездаровую фазу і сапраўды здольныя разбіць «сямейную лодку»? Тады, калі сваркі не нясуць ніякага канструктыўнага выніку. Калі прычына адна і тая ж, а канфлікты з гэтай канкрэтнай нагоды сталі ў вашай сям'і хранічнымі. Гэта значыць, што альбо вы не можаце ці не жадаеце данесці свой пункт гледжання да апанента, альбо ён не хоча ці не можа вас пачуць. Дарэчы, нежаданнем данесці тую ці іншую інфармацыю да партнёра часцей «грашаць» жанчыны — існуе ўстойлівы «жаночы міф», што мужчына павінен сам здагадацца, чым не задаволена каханая. Але ж іншы чалавек, якім бы блізкім і родным ён ні быў, не ўмее чытаць вашы думкі. Кажыце аб тым, што вас турбуе, раяць сямейныя псіхолагі. Недахоп інфармацыі толькі пагаршае канфлікт і прыводзіць да пастаяннай знясільвальнай барацьбы. Але кажыце спакойна, добразычліва і ў правільны час: тады, калі другі ўдзельнік адносін гатовы вас пачуць. Менавіта такі падыход — залог моцнай і шчаслівай сям'і.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# «ЗА ЎСЁ ЎДЗЯЧНА МАМЕ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Аднак, нягледзячы на тое, што ў мамы тэхнічная адукацыя, яна вельмі творчы чалавек. Расціла мяне адна, паспявала і працаваць, і ўдзяляць мне час па максімуме. Усе грошы, якія зарабляла, укладала ў маю адукацыю. Адзенне мне шыла. Старалася рознабакова развіваць, — расказвае дзяўчына. У дзяцінстве будучая балерына наведвала студыю Рышальда Мая пры Нацыянальным мастацкім музеі, тэатральную студыю «Рэвю», займалася лепкай, скончыла музычную школу. За ўсё гэта яна дзякуе маме.

Артыстка гаворыць, што не марыла стаць балерынай. Калі споўнілася дзесяць, з мамай паехалі на экскурсію ў Санкт-Пецярбург. Гуляючы па вуліцы Зодчага Росі, убачылі аб'яву аб наборы ў балетную школу. Тацццяна Аляксееўна прапанавала паспрабаваць. Да таго моманту Ірына ні разу не была ў тэатры. Яна прайшла прагляд. Аднак жыць у Пецярбургу не было магчымасці. Здала ўступныя экзамены ў Мінскую харэаграфічную гімназію-каледж. Так трапіла ў балетны свет.

— За мае дзесяць сезонаў у тэатры мама наведвала амаль кожны спектакль. Дзесьці заўважала памылкі, недахопы. Проста



была побач, падтрымлівала. Цяпер ужо ходзіць менш, — дзеліцца танцоўшчыца.

Тацццяна Аляксееўна навучыла дачку не кідаць справу на паўшляху.

— Падабаецца ці не, але пачатае трэба даводзіць да канца. Таму, каб пачаць нешта новае, трэба было падумаць, ці зможаш гэта завяршыць. Магчыма, такі падыход і дапамог дасягнуць пэўнага выніку, — кажа Ірына.

## «КАЛІ ТАБЕ ПЛЮЮЦЬ У СПІНУ, ЗНАЧЫЦЬ, ТЫ НАПЕРАДЗЕ»

Дзяўчына прызнаецца: было складана ў прафесіі. Тацццяна Аляксееўна заўсёды вучыла дачку дабівацца ўсяго самой. Яе не расцілі балерынай: з дзяцінства была ў спорце — займалася мастацкай гімнастыкай. Перад балерынай таксама ставілі задачы і вучылі іх выконваць. І цяпер яна стараецца рабіць тое, чаму навучалася за ўсе гады, добра.

— Мой дэвіз па жыцці — словы Людмілы Маркаўны Гурчанкі: «Калі табе плююць у спіну, значыць, ты наперадзе». І калі мне цяжка, успамінаю гэты выраз і іду далей, — кажа Ірына. — А яшчэ лічу, што ў аснове поспеху ляжаць правалы і памылкі, без гэтага не будзе выніку. Вядома, што балерына — гэта не толькі прыгажосць, а яшчэ і пастаянная цяжкая праца.

Працоўны дзень пачынаецца прыкладна ў 8.00-8.30. Снедае, прымае душ. Едзе ў тэатр загадзя, каб разагрэцца, пераапрануцца і заплесціся. У дзесяць павінна стаяць каля станка. Пасля — масаж, наведванне ўрача. У дзве гадзіны — рэпетыцыі. Ёсць час, каб схадзіць у медкорпус, на прымерку новага касцюма, на інтэрв'ю ці здымкі.

— Наш тэатр рэпертуарны, — тлумачыць балерына. — Таму мяне можна ўбачыць ва ўсіх пастаноўках. Не заўсёды танцую ў пачатку спектакля. Прыходжу за дзве гадзіны да выхаду на сцэну. Гэтага ў прынцыпе дастаткова для падрыхтоўкі. Бывае, што вечарам толькі рэпетыцыя. Пачынаецца ў шэсць гадзін і завяршаецца прыкладна ў дзевяць. Скончылася — і ты зноў распранаешся, расплятаешся, ідзеш дадому. Як правіла,



З мамай і бабуляй.

адразу кладуся спаць, рэдка калі пакідаю нейкія справы на вечар.

## АДПАЧЫНАК — ТОЛЬКІ Ў МАРАХ

Свой выхадны дзень балерына з гумарам называе «канапаляжаннем».

— Гэта, канешне, у ідэале (*смяецца*). Вольны дзень у нас усяго толькі адзін. І на яго звычайна звальваюцца такія справы, як прыбраць кватэру, прыгатаваць, разабраць гардэробную, падшыць пуанты, пачытаць, калі атрымаецца, пайсці да ўрача, а яшчэ схадзіць на вучобу (калі вучышся паралельна). Таму ідэальны выхадны — праведзены ў гарызантальным становішчы. На жаль, рэдка так бывае, бо часта запланаваны здымкі, інтэрв'ю, сустрэчы. Так што адпачынак толькі ў марах, — распавядае дзяўчына. Ірына кажа, што не заўсёды атрымліваецца выязджаць за горад. Аднак, калі з'яўляецца магчымасць, едзе на любімае лецішча. Гэта для яе месца сілы.

— Там магу пабыць сам-насам з прыродай, сваімі думкамі. Займаюся рознымі справамі: кашу траву, збіраю ягады, вару варэнне, паліваю агарод і нават фарбую. Літаральна нядаўна фарбавала століь, магу і прыбіць штосьці. Карацей, на лецішчы займаюся ўсім, — усміхаецца Ірына.

## ДАБІВАЦЦА ЎСЯГО САМОЙ

Ірыне не дораць кветкі ў звычайным жыцці — толькі на сцэне.

— Верыце ці не, але гэта праўда (*усміхаецца*). Кветкі мне дораць толькі пасля спектакляў. Тым больш каштоўным становіцца выхад на сцэну і сустрэча з гледачом. Прыемна ведаць, што там чакаюць. Мая прафесія няпростая, у ёй важны вынік. Разумееш, дзеля чаго працуеш, — дзеля захопленага позірку людзей, іх апладысментаў.

Усе падарункі ад гледачоў для нашай гераіні вельмі важныя. Яна ставіцца да іх з асаблівай шчымлівасцю. У кватэры ім адведзена пэўнае месца. І, спадзяецца артыстка, з цягам часу з'явіцца дом і прастора, дзе можна размясціць прыкладна падорanae.

— Хачу, каб кожная рэч знайшла сваё месца. Сярод незвычайных — карціна з дзесяці тысяч маіх фота. Яе падарылі пасля майстар-класа па класічным танцы, які давала ў Міжнародным цэнтры балета ў Пецярбургу. Атрымаць такую вялікую карціну было незвычайна. А ехаць з ёй у аэрапорт — тым больш (*смяецца*). А яшчэ калекцыяную цацачных кароў. Многія дзеці гэта ведаюць, і калі прыходзяць да мяне



на спектакль, прыносяць іх у падарунак. Я такое вельмі люблю, ды любая ўвага для артыста — ужо вялікі і незвычайны падарунак, — гаворыць Ірына.

## «КАБ САБРАЦЦА РАЗАМ, НАГОДЫ НЕ ТРЭБА»

— Мы з мамай — дамашнія людзі. Нават паміж рэпетыцыямі з радасцю прыбягаю дадому. Вялікі перапынак абсалютна не магу праводзіць у грымёрцы. Люблю ствараць утульнасць, хоць і няма на гэта часу. Нядаўна перабірала гардэроб, і аказалася, што там зусім не хапае хатняга адзення. Пасля святочных дрэскодаўскіх сукенак у мяне адзенне для дома на другім месцы. Настолькі абажаю адчуваць сябе дома камфортна, што лепш набуду яшчэ адзін хатні касцюм, чым убор для выхаду ў свет.

Для Ірыны святы ў коле сям'і — дастаткова абстрактнае словазлучэнне. Як яна расказвае, з блізкіх родных у яе — толькі маці і бабуля, усе астатнія — стрыечныя ці траюрадныя. Да таго ж насычаны графік.

— У чатыры гады я на дастаткова высокім узроўні займалася мастацкай гімнастыкай. І перавага аддавалася майму развіццю, а не сямейным сустрэчам. Увогуле, лічу, каб сабрацца разам, нагоды не трэба.

І хоць «святочныя сталы», як гаворыць Ірына, у сям'і бываюць нячаста, Тацццяна Аляксееўна заўсёды стараецца прыгатаваць штосьці смачнае.

— Яшчэ з дзяцінства ў нас традыцыя пячы тарты. Яны робяцца з невялікіх эклераў. Іх выпякае матуля. Гатуецца крэм са сметанковага масла альбо са згушчонкі, усё выкладваецца, заліваецца і выносіцца на балкон. Гэты дзіцячы ўспамін, калі хадзіла і глядзела, ці гатовыя эклерчыкі, застанецца назаўсёды, — успамінае дзяўчына.

**«Падабаецца ці не, але пачатае трэба даводзіць да канца. Таму, каб пачаць нешта новае, трэба было падумаць, ці зможаш гэта завяршыць».**

У сям'і Ірыны ніколі не было, як яна называе, культу дня нараджэння.

— Месяц рыхтуешся, усё іншае адмяняеш, а потым месяц адпачываеш ад святкавання. Гэта не наша гісторыя, бо я была ў спорце, а там жорсткі графік. Пасля ў балеце — не менш жорсткі. Потым — тэатр. Самыя яркія эмоцыі адчуваю ад спектакля, — прызнаецца Ірына, — на якім бачу вынік, усё тое, што напрацавала. А дзеля дня нараджэння не трэба нічога рабіць. Ён усё роўна надыдзе, тут без варыянтаў. Дарэчы, заўважыла, што мяне віншуюць часцей з добрым спектаклем. А яшчэ калі атрымала пасведчанне кіроўцы, у «Інстаграме» павіншавала каля ста чалавек!

**«У аснове поспеху ляжаць правалы і памылкі, без гэтага не будзе выніку. Вядома, што балерына — гэта не толькі прыгажосць, а яшчэ і пастаянная цяжкая праца».**

## БАЛЕРЫНА Ў ГЛЯДЗЕЛЬНАЙ ЗАЛЕ

Другі любімы горад Ірыпасля роднага Мінска — Санкт-Пецярбург.

— У паўночнай расійскай сталіцы бываю ўсё часцей і часцей. Наведваю па магчымасці балетныя спектаклі ў Марыінскім тэатры. Балерына ў глядзельнай зале нічым не адрозніваецца ад балерыны за кулісамі, — упэўнена артыстка. — Усё роўна ідзе няспынны аналіз: добра — дрэнна, так — не так, падабаецца альбо не... Таму, скажу шчыра, доўгі час за сваю кар'еру не глядзела спектаклі з залы. Не магла адключаць мозг. І толькі пасля дзявятага сезона пачала хадзіць. І здараецца, што падчас пастаноўкі хочацца сказаць: «Так не трэба». Аднак гэта мастацтва, і двух аднолькавых спектакляў увогуле не бывае.

* * *

...Напрыканцы размовы мы закранулі тэму стварэння ўласнай сям'і. Якой Іна ўяўляецца нашай гераіні, каго б хацела бачыць побач з сабой па жыцці?

— Мы ўсе, асабліва дзяўчаты, задумваемся пра будучыню, пра сям'ю. Хочам адно, а ў рэальнасці так не заўсёды атрымліваецца. У мяне яшчэ мала вопыту, таму не разабралася, які тыпаж падабаецца. Але гэта павінен быць той, хто мяне пакахае — без нюансаў, незалежна ад прафесіі і жыццёвага ўкладу. Ён будзе цаніць, паважаць. Гэта надзейны чалавек, якому можна верыць і смела ісці з ім у заўтрашні дзень. Бо прафесія артыста нестабільная: разлічваеш толькі на сябе самога і працуеш кожны дзень на вынік. І калі побач акажацца чалавек, з якім будзе камфортна, я звяжу з ім сваё жыццё.

Чытачам «Сямейнай газеты» хачу пажадаць, каб вашы мары спраўджваліся. Не бойцеся ставіць перад сабой самыя смелыя мэты. Шануйце тое, што ёсць, а нам ёсць што шанаваць!

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з архіва балерыны.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Ваза Габбро полир высота 250 мм ЭН, 26 шт.; ваза Габбро б/н; полуваза бетонная малая, 2 шт.; полуваза бетонная большая, 2 шт.; урна гр. Капустинский полир. 50 по кальк., 2 шт. | 1704,96 | 170,50 | 85,25 |
| 2 | Плита цок. гр. Возр. тер 60 мер. 400x400, 23,36 м$^2$ | 1345,54 | 134,55 | 67,28 |
| 3 | Плита цок. гр. Возр. тер 60 кал. ПГКЗ-12, 4,76 м$^2$; плита цок. гр. Возрождение кол. 60 кал. 100x100, 6,3 м$^2$; плита гр. покост. тер. т. 40 мм, 1,52 м$^2$ | 937,54 | 93,75 | 46,88 |
| 4 | Пл. обл. гр. Манс. пол 30 № 211, 1,77 м$^2$; пл. обл. гр. Манс. лощ 30 150xL б/з, 5,25 м$^2$; пл. обл. гр. Манс. лощ 30 100xL б/з, 6,5 м$^2$; пл. обл. гр. Манс. лощ 30 200xL б/з, 2,81 м$^2$; пл. обл. гр. Манс. лощ 30 250xL б/з, 8,93 м$^2$; пл. обл. гр. Манс. пол 30 150xL, 8,98 м$^2$; пл. обл. гр. Манс. тер 35 150xL, 2,71 м$^2$; пл. обл. гр. Манс. пол 35, 3,62 м$^2$ | 1888,94 | 188,89 | 94,45 |
| 5 | Пл. обл. гр. Возр. шлиф 30, 18,36 м$^2$ | 1057,54 | 105,75 | 52,88 |
| 6 | Пл. обл. гр. Янцев. тер 30, 7,76 м$^2$; пл. обл. гр. Янцев. шлиф 30, 5,58 м$^2$; пл. обл. гр. Янцев. тер 30 б/с сырья, 10,39 м$^2$; пл. обл. гр. Янцев. тер 30 полоса, 3,96 м$^2$; пл. цок. пил. гр. Янцев. шлиф 40, 0,61 м$^2$; пл. цок. пил. гр. Янцев. пол 60, 4,67 м$^2$; пл. накр. пил. гр. Янцев. шлиф 40, 5,04 м$^2$ | 1368,36 | 136,84 | 68,42 |
| 7 | Пл. цок. гр. Янцев. тер 50, 5,04 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. тер 40 5 гр., 9,5 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. пол 60 5 гр., 2,53 м$^2$; пл. цок. пил. гр. Янцев. шлиф 40 5 гр., 2,93 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. пол 40 полоска, 2,23 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. пол 60 полоска, 3,56 м$^2$; пл. цок. пил. гр. Янцев. пол 35, 4,46 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. пол 35, 0,67 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. тер 55, 4,22 м$^2$ | 1 265,04 | 126,50 | 63,25 |
| 8 | Пл. цок. гр. Янцев. тер 40 с/з, 27,61 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. тер 40 полоска, 19,95 м$^2$ | 1 712,16 | 171,22 | 85,61 |
| 9 | Пл. цок. гр. Янцев. пол 40 б/с сырья, 4,6 м$^2$; пл. накр. гр. Янцев. пол 60, 6 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. шлиф 60 с/з по, 14,04 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. тер 60 200xL, 5,47 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. тер 60 290xL, 2,64 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. тер 60 150xL, 8,45 м$^2$; Пл. цок. гр. Янцев. тер 60 250xL, 3,31 м$^2$ | 1 602,22 | 160,22 | 80,11 |
| 10 | Пл. цок. гр. Янцев. 42-11 нак. парапеты, 34,85 м$^2$; плита гр. серый Янцевский т/о 50 (450*450), 10 м$^2$ | 1 926,60 | 192,66 | 96,33 |
| 11 | Плита цок. Янцевский тол. 40 т/о 120, 150 x L, 25,12 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. скала 60 150xL б/з, 2,17 м$^2$; пл. цок. гр. Янцев. скала 60 150xL б/з, 2,17 м$^2$ | 1 844,30 | 184,43 | 92,22 |
| 12 | Плита цок. Янцевский тол. 60 т/о скала 150xL, 14,4 м$^2$; плита цок. Янцевский тол. 40 пол. 150xL, 2,98 м$^2$ | 1 167,94 | 116,79 | 58,40 |
| 13 | Плита цок. Янцевский тол. 60 пол. 200, 150 x L, 12,69 м$^2$; плита цок. Янцевский тол. 50 т/о 150xL, 1,35 м$^2$; плита цок. Янцевский 60 т/о 200xL, 4 м$^2$; плита цок. Янцевский 60 пил. 200xL, 1,89 м$^2$; плита цок. Янцевский 35 т/о 200xL, 4,07 м$^2$; плита цок. Янцевский 35 пол. 200xL, 3,4 м$^2$; плита цок. Янцевский 40 т/о 150xL,1,5 м$^2$ | 1 942,08 | 194,21 | 97,10 |
| 14 | Пл. обл. гр. Возр. пол 25 мер., 7,13 м$^2$; пл. обл. гр. Возр. пол 25, 1,15 м$^2$; пл. обл. гр. Возр. шлиф 30 200xL, 6,28 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. пол 35, 6,62 м$^2$ | 1 219,97 | 122,00 | 61,00 |
| 15 | Пл. цок. гр. Возр. шлиф 40 200xL, 8,27 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. шлиф 40, 5,1 м$^2$; пл. накр. гр. Возр. пол 40, 4 м$^2$; ступени гр. Возр. шлиф 140 мер., 2,19 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. пол 40 400xL, 4,53 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. пол 40 с/з, 1,5 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. тер 40 полоса, 3,68 м$^2$ | 1 685,95 | 168,60 | 84,30 |
| 16 | Пл. цок. гр. Возр. тер 50, 17,14 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. тер 50 полоска, 12,19 м$^2$ | 2 018,50 | 201,85 | 100,92 |
| 17 | Пл. цок. гр. Возр. тер 60 полоса, 6,32 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. пил 60, 14,66 м$^2$; ступени гр. Возр. шлиф 60 мер., 0,46 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. пил 65 380xL, 4,08 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. шлиф 50, 0,86 м$^2$; Пл. цок. гр. Возр. шлиф 40 мер., 3,46 м$^2$ | 1 718,78 | 171,88 | 85,94 |
| 18 | Плита обл. Возрождение 30 т/о 150L, 200L, 250L, 99,67 м$^2$ | 10 046,74 | 1004,67 | 502,34 |
| 19 | Плита обл. Возрождение 30 пил 200xL, 10,03 м$^2$; плита цок. Возрождение тол. 40 пил 200xL, 4,66 м$^2$; пл. обл. гр. Возрождение пол. т, 30, 1,41 м$^2$ | 1 561,97 | 156,20 | 78,10 |
| 20 | Камень брусчатый пиленный КбрГП-1, светло-серый по типу Мансуровский (198x198x80), 95,22 м$^2$; кам. брус. гр. Манс. тер 80 100x300, 2,59 м$^2$; кам. брус. гр. Манс. тер 120 125x250, 4,53 м$^2$; камень брусчатый пиленный КбрГП-4, светло-серый по типу Мансуровский (298x298x80), 17,67 м$^2$ | 7 375,84 | 737,58 | 368,79 |
| 21 | Камень брусчатый пиленный КбрГП-11, красный по типу Алла-Носкуа (198x198x80), 37,92 м$^2$ | 2 365,90 | 236,59 | 118,29 |
| 22 | Плита гранитная типа «серая» 400*120*50, 272,31 м$^2$ | 19 606,32 | 1960,63 | 980,32 |
| 23 | Плита цок. Возрождение т/о 100x200*80, 0,02 м$^2$; плита цок. Возрождение т/о 100xL 60, 4,54 м$^2$; плита цок. Возрождение тол. 60 пил. 100xL, 8,5 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. тер 80, 2,56 м$^2$ | 1 574,50 | 157,45 | 78,72 |
| 24 | Пл. цок. гр. Возр. скала 60 150xL, 9,48 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. тер 60 скала 300 xL, 5,5 м$^2$; пл. цок. гр. Возр. тер 80 скала 200xL, 0,77 м$^2$; плита цокольная колотая гр. «Возраждение» Т=80 кальк., 2 м$^2$; плита цок. Возрождение т/о 200x200*80, 0,04 м$^2$ | 1 112,83 | 111,28 | 55,64 |
| 25 | Пл. обл. гр. Габбродиабаз полир. 30 мерн. 86/Г, 9,39 м$^2$; плиты обл. Габбро пол. 20 мерные 100xL, 0,5 м$^2$ | 2 136,24 | 213,62 | 106,81 |
| 26 | Плита цок. Капустинский пол. 100*L т30 200*L, 7,15 м$^2$; плита обл. Капустинский т/о 150*L x20, 4,2 м$^2$; плита цок. Капустинский 120 пил. 100*L, 4,1 м$^2$; пл. обл.гр. Капус. пол 30 б/з, 2,07 м$^2$; плиты облиц. гр. Капустинский полир. 30, 1,71 м$^2$; пл. обл. гр. Капус. тер 30 150xL, 2,12 м$^2$; плиты облиц. Капустинский полир 30 мерн., 0,11 м$^2$; Пл. цок. гр. Капус. пол 40 мер. полоска, 3,03 м$^2$; Пл. цок. гр. Капус. скала 60x80 100xL, 2,91 м$^2$ | 3 421,82 | 342,18 | 171,09 |
| 27 | Камень бортовой ГВП полир. гр.»Возраждение» Т=200 (кальк), 6,65 пог. м; камни борт. ГПВ Возрождение пол., 28,92 пог. м | 3 756,19 | 375,62 | 187,81 |
| 28 | Камни борт. 5 ГП Капустинский пил., 23,39 пог.м; Кам. борт. гр. Капус. пил 200 80xL, 4,9 пог. м | 3 006,10 | 300,61 | 150,30 |
| 29 | Плита накрыв. Капустинский, 13 шт. | 1 996,80 | 199,68 | 99,84 |
| 30 | Пл.обл.гр.А-Носк. 25 пил. 100xL, 1,92 м$^2$; Пл.обл.гр.А-Носк. 20 пил. 100xL, 1,92 м$^2$; Пл.цок.гр.А-Носк. 40 т/о 150xL, 0,82 м$^2$; Пл.цок.гр.А-Носк.60 скала 150xL, 3,9 м$^2$; Пл.обл.гр.А-Носк. 30 о/о 100xL, 9,14 м2; Пл.обл.гр.А-Носк. 25 пол. 150xL, 4,02 м$^2$; Пл.обл.гр.А-Носк. т/о 30, 0,7 м$^2$; Пл.обл.гр.А-Носк.тер30 пол., 6,52 м$^2$; Пл.цок. гр.А-Носк.пол40 300xL, 1,74 м$^2$ | 1 731,54 | 173,15 | 86,58 |
| 31 | Брусчатка гр. галтованная пиленая, светло-серая, природ. камень, 10x10x8 см т=80, 29,77 м$^2$ | 1 857,65 | 185,76 | 92,88 |
| 32 | Заготовка гр-т Анастасиевский т/о 30 (с.з.), 96,55 м$^2$ | 4 634,40 | 463,44 | 231,72 |
| 33 | Камень бутовый (т св. 80мм), 0,67 м$^3$; Порода скальная для производства щебня, 14,51 м$^3$; Заготовка Jura Limestone beige пил. 145 с.з, 1,69 шт.; Заготовка Jura Limestone beige пил. 30 с.з, 5,85 шт. | 520,85 | 52,08 | 26,04 |
| 34 | Плита гранитная т=80 мм, Плита мощения пиленая т=80 мм, Плита мощения пилено-колотая, т=80 мм, 98,54 м$^2$ | 6 621,89 | 662,19 | 331,09 |
| 35 | Борт гранитный б/у (с пл.Независ.), 50,69 пог. м | 1 459,87 | 145,99 | 72,99 |
| 36 | Плита цок. Габродиабаз тол.40 т/о 200, 150 xL, 10,71 м$^2$; Плита цок. Габродиабаз тол. 60, скала 150 x L, 0,68 м$^2$ | 2 460,24 | 246,02 | 123,01 |
| 37 | Плита обл. Габбро 20 пол. 100,150,200 x L, 52,13 м$^2$ | 11 260,08 | 1 126,01 | 563,00 |
| 38 | Плита обл. мрам. Кибик Кардонский 20 пол. 150,200,300 X L, 16,68 м$^2$ | 1 601,28 | 160,13 | 80,06 |
| 39 | Плита обл. Роговский тол. 20 пол. 120, 250, 300 x L, 59,56 м$^2$; Плита обл. Роговский тол. 20 шлиф. 200xL, 6,24 м$^2$ | 7 264,32 | 726,43 | 363,22 |
| 40 | Плита цок. Токовский тол. 80 т/о 200xL, 13,41 м$^2$; Плита цок. Токовский тол.60 т/о 100xL, 3,28 м$^2$; Пл.цок.гр.Токов.тер80 ГПТ-1 мер., 9,08 м$^2$; Кам.брус.гр.Токов. тер60 180xL, 5,2 м$^2$; Кам.брус.гр.Токов.80 100x200, 3,5 м$^2$; Кам.брус.гр.Токов. тер80 90x180, 2,53 м$^2$ | 2 912,30 | 291,23 | 145,62 |
| 41 | Плита обл. Балтийский тол. 30 т/о 200 x L, 2,88 м$^2$; Плита цок.Балтийский тол.30 пол. 150 x L, 4,2 м$^2$; Плита цок.Балтийский тол. 80 т/о 100x L, 5,8 м$^2$; Борт 5 ГП Балтийский пил., 17 пог.м; Пл.обл.гр.Балт-Бр.пол30 300xL б/з, 1,67 м$^2$; Пл.обл. гр.Балт-Бр.пол30 305xL, 0,23 м$^2$; Борт гр.Балт.пил200 5ГП 80xL, 6,93 пог.м; Пл.цок. гр.Балт.пол40 100xL б/з, 3,24 м$^2$; Кам.брус.гр.Балт-Бр.тер80 100x200, 3,16 м$^2$; Пл.цок.гр.Балт-Бр.тер40 300xL, 2,44 м$^2$; Пл.цок.гр.Балт.пол40 150xL б/з, 3,76 м$^2$; Пл.обл.гр.Балт-Бр.пол30 300xL ТНП, 2,41 м$^2$; Пл.обл.гр.Балт-Бр.пол30 300xL ТНП, 2,41 м$^2$; Плита цок.Балтийский тол.30 т/о, 1,89 м$^2$ | 3 563,97 | 356,40 | 178,20 |
| 42 | Плита обл. Габбродиабаз тол. 30 пол. 150xL, 15,9 м$^2$; Плита обл. Габбродиабаз тол. 30 пол. 150 x L, 5,4 м$^2$ | 4 600,80 | 460,08 | 230,04 |
| 43 | Плита облиц. т/о гр. «Покостовский» т=30 рядовая, 0,63 м$^2$; Плита обл. Покостовский т. 30 пол. 150, 200,250 x L, 17,28 м$^2$; Плиты облиц.гр.Покостовский пил.60 мерные, 0,9 шт.; Камни бортовые 5ГП Покостовский пил., 5,61 пог.м; Плиты облиц.гр.Покостовский пил.60 мерные, 0,9 шт. | 2 087,50 | 208,75 | 104,37 |
| 44 | Плита цок. Покостовский тол.40 шлиф. 300xL, 9,7 м$^2$; Плита цок. Покостовский 40 т/о 200xL, 8,03 м$^2$; Плита цок. Покостовский тол. 60 т/о 100xL, 6,6 м$^2$ | 2 335,68 | 233,57 | 116,78 |
| 45 | Плита обл. Межиричка тол.30 т/о 150xL, 9 м$^2$; Плита цок. Межиричка тол. 60 пол. 200xL, 7,13 м$^2$; Плита обл. Межиричка тол. 30 пол. 200xL, 8,86 м$^2$; Плита цок. Межиричка тол.60 т/о скала 150xL, 2,4 м$^2$; Камни бортовые 5 ГП Межиричка пил., 20,22 пог.м | 2 068,24 | 206,82 | 103,41 |
| 46 | Плита обл. Габбродиабаз тол30 т/о 600,200 xL, 13,8 м$^2$; Плита цокольная гр. Габбродиабаз колотая Т= 80( кальк.), 1 м$^2$ | 3 196,80 | 319,68 | 159,84 |
| 47 | Плита цок.Мансуровская тол. 60 т/о 100xL, 159,4 м$^2$; Плита Мансур т/о (600*380*30), 18,24 м$^2$ | 8 270,92 | 827,09 | 413,55 |
| 48 | Плита цок.Мансуровская тол. 40 т/о 150xL, 4,42 м$^2$; Плита обл. Мансуровская тол. 20 шлиф. 300xL, 37,08 м$^2$; Плита цок. Мансуровская тол. 60 шлиф. 360xL, 0,43 м$^2$; Плита обл. Мансуровская тол.30 т/о 200xL, 28,02 м$^2$; Камень бортовой гр. Мансуровский пол. 180x180, 2,5 пог.м; Плита цок.Мансуровская тол.60 скала, 1,75 м$^2$ | 3 554,35 | 355,44 | 177,72 |
| 49 | Брусчатка кол.Габбро Слипчицкого (100), 39,16 м$^2$ | 3 947,33 | 394,73 | 197,37 |
| 50 | Пл.обл.гр.Емел.шлиф30, 2,89 м$^2$; Пл.обл.гр.Емел.пол30 200xL, 1,3 м$^2$; Пл.обл. гр.Емел.шлиф30 300xL, 1,11 м$^2$; Пл.обл.гр.Емел.тер25 200xL, 1,38 м$^2$; Пл.обл. гр.Емел.тер30 150xL б/з, 0,42 м$^2$ | 310,13 | 31,01 | 15,51 |
| 51 | Пл.цок.гр.Емел.пил40, 14,16 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.шлиф40 250xL, 4,28 м$^2$; Пл.цок. гр.Емел.пол40 150xL, 21,24 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.пол40 200xL, 0,92 м$^2$; Пл.цок. гр.Емел.тер40 400xL, 0,34 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.тер40 100xL, 3,71 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел. тер40, 14,09 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.тер40 200xL, 3,96 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.тер40 150xL, 15,64 м$^2$; Пл.накр.гр.Емел.тер40 300xL, 3,49 м2; Пл.цок.гр.Емел.пол40 б/з, 1,3 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.шлиф35 300-600, 0,9 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.шлиф35 400xL, 1,68 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.пол40 120xL, 1,98 м$^2$; Пл.цок.гр.Емел.тер40 300xL, 1,83 м$^2$ | 5 181,31 | 518,13 | 259,07 |
| 52 | Пл.цок.гр.Покос.тер45, 2,16 м$^2$; Пл.цок.гр.Покос.тер60, 2,36 м$^2$; Пл.обл.гр.Покос. тер30 150xL, 6,09 м$^2$; Пл.цок.гр.Покос.пол40 200xL, 6,79 м$^2$; Пл.цок.гр.Покос. тер60 200xL, 5,42 м$^2$; Пл.цок.гр.Покос.тер60 400xL, 3,4 м$^2$; Пл.цок.гр.Покос.скала60, 5,86 м$^2$ | 2 030,82 | 203,08 | 101,54 |
| 53 | Камень брусчатый пиленный КбрГП-2, темно-серый по типу Глушковичи/Микашевичи (398x198x80), 24,71 м$^2$ | 1 541,59 | 154,16 | 77,08 |
| 54 | Плита облицовочная полир гр.Роговский т=20, 15,94 м$^2$ | 1 759,78 | 175,98 | 87,99 |
| 55 | Пл.цок.гр.Манс.пол40 240xL, 4,32 м$^2$; Пл.цок.гр.Манс.пол35 230, 3,1 м$^2$; Пл.цок. гр.Манс.пол40 200xL, 5,45 м$^2$; Пл.цок.гр.Манс.пол60 400xL, 3,42 м$^2$; Пл.цок. гр.Манс.скала60 150xL, 2,29 м$^2$; Пл.цок.гр.Манс.пол60 250xL, 0,26 м$^2$; Пл.цок. гр.Манс.тер60 200xL, 1,83 м2; Пл.цок.гр.Манс.тер60 скала № 375, 1,5 м$^2$; Пл.цок. гр.Манс.тер40 100xL б/з, 1,77 м$^2$; Пл. обл. гр. Манс. лощ 30 200xL ТНП, 2,31 м$^2$; Пл.обл.гр.Манс.пол30 ТНП, 12,25 м$^2$; Пл.обл.гр.Манс.пол30 330xL ТНП, 5,63 м$^2$; Плита облиц. т/о гр. Мансуровский т=30, 5,94 м$^2$; Плита облиц. шлиф. гр. Мансуровский т=20, 5,88 м$^2$; Пл.обл.гр.Манс.пол30 мер., 0,23 м$^2$ | 2 615,74 | 261,57 | 130,79 |
| 56 | Пл.цок.гр.А-Носк.тер60 400xL, 3,42 м$^2$; Пл.цок.гр.А-Носк.тер35 320, 2,58 м$^2$; Пл.цок.гр.А-Носк.шлиф40, 2,67 м$^2$; Пл.цок.гр.А-Носк.тер80, 7,82 м$^2$; Пл.цок.гр.А-Носк.тер50 полоска, 7,36 м$^2$; Пл.цок.гр.А-Носк.тер80 полоска, 3,4 м$^2$ | 1 962,00 | 196,20 | 98,10 |
| 57 | Пл.обл.гр.Рогов.пол20 300xL б/з, 14,3 м2; Пл.обл.гр.Рогов.пол20 120xL б/з, 10,36 м$^2$ | 2 722,46 | 272,25 | 136,12 |
| 58 | Пл.цок.гр.Танск.пол50 300x500 б/з, 7,2 м$^2$; Пл.цок.гр.Танск.пол50 220x600 б/з, 2,31 м$^2$; Пл.цок.гр.Танск.тер60 150xL, 1,5 м$^2$; Пл.цок.гр.Танск.тер60 360xL, 2,03 м$^2$ | 938,88 | 93,89 | 46,94 |
